Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 ЛЮТАГА 2024 г. ЧАЦВЕР № 27 (30161)

ЧАМУ ВАЖНА ДБАЦЬ АБ ЗДАРОЎЁ 5

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў ПОЛЬШЧЫ 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Падатковы складнік як найбольш важная частка фінансавай сістэмы краіны, нягледзячы на няпростыя эканамічныя ўмовы, з'яўляецца дастаткова адэкватным і адпаведным нашай макраэканамічнай сітуацыі. Мы назіраем рост як па зборы падатковых плацяжоў, так і па паступленні ў бюджэт. Доля падатковых плацяжоў у бюджэце краіны застаецца высокай і складае 66 працэнтаў».

КАРОТКА

- **У Беларусі пачала функцыянаваць Акадэмія адукацыі. Новая ўстанова створана на базе Нацыянальнага інстытута адукацыі і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.**
- Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 лютага склалі $8,093 млрд.
- **Беларускія суды змянілі графік работы для аператы ўнага разгляду скаргаў падчас выбарчай кампаніі.**
- У спарткомплексе «Сялец» пабудуюць Дом біятлона і павялічаць даўжыню лыжароллернай трасы.
- **Белстат: чалавечы фактар стаў прычынай больш за 95 % лясных пажараў у Беларусі ў мінулым годзе.**
- Вакцыну ад карыесу распрацоўваюць у Беларусі.
- **«Белавія» аднавіла палёты ў Шарм-эль-Шэйх з Віцебска.**
- Новы плавальны басейн для дзяцей і дарослых пабудуюць у Свіслачы.

ISSN 1990 — 763X

Віцебская ткачыха

Фота БелТА.

Праца нялёгкая, але цікавая і адказная, патрабуе пастаяннай уважлівасці. Так апісвае сваю прафесію ткачыха Валянціна ПАТАСКАЕВА. Тчэ яна не проста тканіны — дывановае палатно: на прадпрыемстве «Віцебскія дываны» яна працуе больш за трыццаць гадоў. Нядаўна жанчына была ўганаравана званнем «Чалавек года Віцебшчыны»

Тэндэнцыі

Пакупкі з сэнсам

Як прадаўцы і пакупнікі мяняюць анлайн-рынак

Электронны гандаль — адзін з самых актыўных у развіцці сёння. Рынак такога гандлю працягвае развівацца і змяняцца пад уплывам прадаўцоў і пакупнікоў, якія імкнуцца да выгады, якасці і сэнсу.

Маркетплейсы, амніканальнасць і сацыяльная адказнасць — не проста модныя словы, а рэальныя ўжо нават і не трэнды, а фактары, якія вызначаюць цяперашні электронны гандаль. Прадаўцы і пакупнікі, якія ўлічваюць і выкарыстоўваюць гэтыя фактары, могуць атрымаць канкурэнтныя перавагі і дамагчыся поспеху на рынку. Разам з **дырэктарам кампаніі правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаславам СЕНІНЫМ** мы разгледзім, што сёння адбываецца на рынку электроннага гандлю.

ШЭСЦЬ ФАКТАРАЎ РОСТУ

Паводле сусветных інфармацыйных агенцтваў, рост рынку электроннай камерцыі захаваецца аж да канца 2024 года пад «эфектам пандэміі». Напрыклад, аб'ём e-commerce ў Расіі па прагнозах экспертаў складзе больш за 7,2 трыльёна рублёў у год. У свеце гэты рост будзе абумоўлены некалькімі фактарамі. Вячаслаў Сенін лічыць, што нас чакае павелічэнне колькасці інтэрнэт-карыстальнікаў і пакупнікоў, асабліва ў рэгіёнах, якія развіваюцца, такіх як Азія, Афрыка і Лацінская Амерыка. Адзначыў ён і развіццё мабільнай камерцыі, якая займае ўсё большую долю ў агульным аб'ёме продажаў электроннага гандлю. Паводле прагнозаў, сёлета мабільная камерцыя складзе 72,9 % ад усяго рынку электроннага гандлю.

СТАР. 4

Жыццялюбы

ПТУШКІ — ЯК ЛЕКІ

Пенсіянер з вёскі Пільніца — пра сваю аддушыну, брыльянтавае вяселле ды «сустрэчу» з бацькам

Пачалося ўсё з аднаго фотаздымка. Яго даслаў Аляксей Раманоўскі, урач-эндакрынолаг з Мінска. На тым фотаздымку — яго тата Антон Аляксеевіч побач з вялікімі белымі мяхамі і аркушам з надпісам «Да зімы гатовыя». «Майму тату 83 гады, ён жыве ў вёсцы Пільніца Мінскага раёна. У яго добрая душа, кожную зіму ён купляе семечкі, якімі падкормлівае сініц і іншых птушак. Тата быў бы шчаслівым, калі б яго фота размясцілі ў газеце. Такім чынам ён хоча натхніць іншых таксама клапаціцца пра пярнатых».

Фота Паўветы ГОЛАД.

СТАР. 12

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ НАВЕДВАЕ РЭСПУБЛІКУ УЗБЕКІСТАН

У Ташкенце кіраўнік беларускай дзяржавы правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым. Сустрэча двух лідараў пройдзе ў фарматах «адзін-на адзін» і ў пашыраным складзе з удзелам дэлегацый.

У цэнтры ўвагі прэзідэнтаў — пытанні паглыблення міждзяржаўных адносін, інтэнсіфікацыі гандлёва-эканамічнага і культурна-гуманітарнага ўзаемадзеяння, развіццё кааперацыйных сувязяў у розных галінах прамысловасці, супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы, навуцы, адукацыі і турызме.

Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў таксама абмяркуюць рэгіянальны і сусветны парадак дня, узаемадзеянне дзвюх краін у інтэграцыйных структурах і на міжнароднай арэне.

Па выніках перагавораў будзе заключаны шэраг двухбаковых дакументаў. У тым ліку чакаецца падпісанне плана мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Узбекістанам на 2024—2025 гады.

ДЗЕЙНЫ ІНСТРУМЕНТ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У Ташкенце праходзіць II Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана

Беларускую дэлегацыю, у склад якой увайшлі кіраўнікі міністэрстваў, рэгіёнаў, прадпрыемстваў і вышэйшых навучальных устаноў, узначальвае намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Леанід ЗАЯЦ. Усяго ў форуме прымаюць удзел больш за 150 прадстаўнікоў абласцей і бізнес-супольнасці нашай краіны.

Праграма мерапрыемства насычаная і разнастайная — акрамя прэзентацыйнай часткі многа часу ўдзяляецца бізнес-складніку. Прадугледжаны тэматычныя секцыі і панэльныя сесіі, на якіх бакі абмяркуюць супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы і харчовай прамысловасці, інвестыцыі і прамысловую кааперацыю, развіццё ўзаемадзеяння ў спорце, турызме і ахове здароўя, а таксама маладзёжную палітыку.

Менавіта наладжванне дзелавых кантактаў і пашырэнне супрацоўніцтва ў розных галінах — ад эканомікі да культуры і адукацыі — і выступае галоўнай мэтай форуму. Сустрэчы ў фармаце B2B на такіх пляцоўках, як Форум рэгіёнаў, заўсёды садзейнічаюць вызначэнню канкрэтных кірункаў далейшага супрацоўніцтва, абмеркаванню магчымых праблем і сумеснаму пошуку іх вырашэння, паспяховай рэалізацыі ўзаемавыгадных ініцыятыў. Увогуле, дамоўленасці на ўзроўні рэгіёнаў — гэта важная частка міждзяржаўных зносін.

І пачатак форуму — таму пацвярджэнне: у Ташкенце ўжо заключана больш за 20 кантрактаў і пагадненняў на $80 млн. А па выніках сустрэчы Леаніда Зайца з узбекскім калегам, намеснікам прэм'ер-міністра Жамшыдам Хаджаевым, агучаны планы на 2024—2025 гады: рэалізаваць праекты больш як на $1 млрд., у тым ліку экспартныя кантракты і інвестыцыйныя праекты.

Як паведаміў журналістам беларускі прэм'ер-міністр, бакі знайшлі паразуменне па ўсіх кірунках, і гэтыя дамоўленасці стануць асновай дарожнай карты супрацоўніцтва паміж краінамі на найбліжэйшыя два гады. Дарэчы, апошнім часам развіццё знешнегандлёвых адносін паміж Беларуссю і Узбекістанам дэманструе толькі станоўчую дынаміку. За 2018—2022 гады тавараабарот паміж краінамі павялічыўся ў 3,2 раза, а ў 2023 годзе аб'ём узаемнага гандлю вырас яшчэ на 12 % і перавысіў $565 млн.

Аднак ёсць магчымасці дасягнуць большых паказчыкаў. Беларускі бок, напрыклад, мае намер стварыць на Узбекістане сумесную вытворчасць дзіцячых прадуктаў харчавання, арганізаваць зборку пасажырскага транспарту Мінскага аўтамабільнага завода, адкрыць прадпрыемствы ў тэкстыльнай галіне. Таксама краіны-партнёры ствараюць зборачную вытворчасць бавоўнаводчых трактароў: у рамках пілотнага праекта на першым этапе будзе пастаўлена 500 трактаракамплектаў. Для Узбекістана, які імкнецца да пашырэння сваёй вытворчай базы, гэты праект надзвычай значны.

Развіваюцца адносіны паміж краінамі і ў сферы адукацыі. Калі пяць гадоў таму ў Беларусі атрымлівалі адукацыю 14 грамадзян Узбекістана, то сёння на сумесных факультэтах вучацца пяць тысяч студэнтаў.

* * *

У 2019 годзе ў Мінску прайшоў I Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана. У мерапрыемствах прынялі ўдзел больш за 1000 чалавек. За два дні яго работы было падпісана 26 прамых пагадненняў паміж рэгіёнамі, пачалася рэалізацыя больш за 20 камерцыйных кантрактаў.

Паводле БелТА.

У РАЗРЭЗЕ РЭГІЁНАЎ

Віцебская і Кашкадар'інская вобласці плануюць супрацоўніцтва ў сферах анкалогіі і дзіцячай хірургіі. Прадстаўнікі рэгіёнаў правялі перагаворы адносна эканомікі, аховы здароўя, турызму, інфармацыйных тэхналогій і спорту. На палях форуму таксама плануецца падпісанне дарожных карт паміж Віцебскай, Кашкадар'інскай і Намаганскай абласцямі на 2024—2025 гады.

Гродзенская і Самаркандская вобласці пашыраюць супрацоўніцтва ў пастаўках беларускіх прадуктаў харчавання, прадукцыі дрэваапрацоўкі і нафтахіміі ва Узбекістан, які сёння займае трэцяе месца ў знешнім тавараабароце Гродзеншчыны з краінамі СНД.

Мінская вобласць мае намер нарошчваць экспарт малочнай прадукцыі і прадукцыі дрэваапрацоўкі, якія карыстаюцца трывалым попытам ва Узбекістане. Па выніках перагавораў ёсць далейшыя планы па павелічэнні аб'ёмаў экспарту сухога абястлушчанага малака, сухога неразведзенага малака і іншай прадукцыі.

Брэсцкая вобласць заключыць шэраг новых дагавораў аб супрацоўніцтве. Прадстаўнікі заходняга рэгіёна падрыхтавалі праекты планаў мерапрыемстваў на 2024—2025 гады па рэалізацыі міжрэгіянальных пагадненняў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве з **Сырдар'інскай і Бухарскай абласцямі.** У рамках форуму таксама плануецца падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж Брэсцкай абласной клінічнай бальніцай і Бухарскім абласным шматпрофільным медыцынскім цэнтрам, а таксама пратакола аб намерах паміж гарадамі Брэст і Бухара.

Падпісаны пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх адносін і план мерапрыемстваў па супрацоўніцтве на 2024—2025 гады паміж сталіцамі абедзвюх дзяржаў — **Мінскам і Ташкентам.**

Па сутнасці

Зрабіце свой выбар самі

Быць дарослым — значыць адказваць за свае ўчынкі і за свой выбар. Гэта датычыцца і чалавека, і цэлай нацыі. За 30 гадоў самастойнага падарожжа па гепалітычным акіяне мы спачатку ад'ёліся каўбасы. Потым розных іншых прысмакаў. Але ж для беларусаў, у цэлым, важна не толькі каб на стале было не пуста. Нам патрэбна духоўная ежа, сэнсы. А самы вялікі сэнс для дарослай нацыі — гэта Незалежнасць і захаванне сябе ў гісторыі. Сярод іншых умоў гэтага сэнсу, такіх як моцная дэмаграфія і нацыянальная годнасць, вялікую ролю адыгрывае палітычная стабільнасць. Добра, калі за ўсё і ўсіх адказвае адзін чалавек. Як бацька ў сям'і. Ён і хату зладзіў і побыт наладзіў. Але ж бацька жадае, каб і яго дзеці калі пасталелі і самі пачалі дбайна і рупліва ладзіць гаспадарку.

Што ўтойваць, шмат разоў нядаўна гучаў такі пасыл: беларусы, маўляў, дарослыя. Таму і патрабуюць перамен. Прабачце, але тое нагадвала псіхалагічны ўзрост падлеткаў. Дзяржава, нібы бацькі, павінна ўсё, а я нічога. Я толькі буду дыктаваць свае ўмовы без усялякай павагі да бацькоў (да дзяржавы). Зразумела, сярод дзесяці мільёнаў — розныя людзі. Але такі настрой у пэўны момант пераважаў у грамадстве... А зараз — калі ласка. Палітычны апгрэйд, вырашай свой лёс сам. Кожны павінен зразумець: у тым ліку ад яго выбару залежыць зараз лёс мільёнаў суайчыннікаў, а ў далейшым — будучыня нашай краіны і нацыі.

Так, зараз якраз той самы момант ісціны, усе ж разумеюць — палітычныя змены. І кожны, хто меў сілы і жаданне, мог паспрабаваць сябе зарэгістраваць у якасці кандыдата ў дэпутаты. Але ж гэта перш за ўсё не статус — гэта адказнасць. У парламентарыяў: адна — законы, і не толькі тыя, што будуць паляпшаць наша з вамі жыццё, але, найперш, тыя навелы, што змогуць зберагчы нашу краіну ад розных выклікаў геапалітычнага і нават ментальнага кшталту.

Мясцовых дэпутатаў таксама чакае вельмі адказная і напружаная праца, дарэчы, на грамадскіх пачатках. Там трэба не толькі мандаты трымаць у руках, там трэба трымаць руку на пульсе жыцця грамадства. Чым жыве звычайны чалавек? Што турбуе насельніцтва тваёй акругі? Нездарма ж кіраўнік краіны неаднаразова засяроджвае на гэтым увагу, патрабуе рэальную карціну пра стан спраў на месцах, каб прымаць правільныя рашэнні.

Правільнае рашэнне павінен прыняць і кожны з нас. Нам спрабуюць перашкодзіць гэта зрабіць. Зноў у ход ідуць сучасныя тэхналогіі. І, у цэлым — супраць адзінага дня галасавання, які заклікаюць байкатаваць, і супраць кандыдатаў, асабліва самых яркіх, распаўсюджваючы пра іх фэйкавы «кампрамат». Так званыя збеглыя заявілі: у выбарах мы не ўдзельнічаем. Яно і зразумела: у Беларусі не назбіраецца столькі прыхільнікаў у дыскрэдытаваных сіл на данатах заходніх разведак. Зрэшты, як гэта не ўдзельнічаюць? Сарваць выбары, накласці паклёп на кандыдатаў, удзельнікаў выбарчых камісій і нават актыўных выбаршчыкаў — вось у чым іх «удзел». Мэта адна — падняць вэрхал у роднай хаце...

Бяспека, у тым ліку інфармацыйная, — справа спецыяльных службаў і ведамстваў. А справа кожнага з нас — зрабіць свой выбар. Калі мы неабыякавыя да будучыні сваёй краіны, сваіх дзяцей, калі нам не ўсё роўна — трэба абавязкова прыйсці на выбары. Мы ж — дарослыя, мы павінны браць на сябе за гэта адказнасць.

А вось за каго галасаваць... Кожны выбірае сам. Выходзячы з уласнага вопыту і нават «голасу сэрца». Але ёсць і агульны так званы лайфхак. Арыентавацца патрэбна не на інтрыгі штучнага інтэлекту, не на тэхналогіі маніпулявання, патрэбна арыентавацца на тое, што ўбачыў на свае вочы, пачуў на свае вушы. Што прапануе кандыдат, як ён размаўляе з людзьмі. Трэба ацаніць, што ў багажы, ці змог рэалізавацца на сваім прафесійным полі і чаму ён ідзе ў дэпутаты. Няблага пачытаць яго праграму. А лепш за ўсё прыйсці на сустрэчу (цяпер якраз у разгары агітацыйны перыяд). Каб зразумець, ці пойдзеце вы ў адным напрамку.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Еўропа рызыкуе застацца без газу з-за эскалацыі канфлікту на Блізкім Усходзе

Краіны Еўрасаюза могуць застацца без энерганосьбітаў з-за эскалацыі канфлікту ў Чырвоным моры і скарачэння паставак з Расіі. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на Associated Press. Паводле інфармацыі агенцтва, атакі мяцежнага еменскага руху «Ансар Алах» (хусіты) на гандлёвыя судны ў Чырвоным моры ствараюць новую пагрозу спынення забеспячэння энерганосьбітамі 27 краін ЕС. Большасць транспартных кампаній вырашылі перанакіраваць свае судны ў абыход гэтага маршруту, што ўжо прывяло да затрымак і адмены паставак. У матэрыяле гаворыцца, што ў студзені было адменена каля 70 працэнтаў паставак звадкаванага прыроднага газу з Катара. Раней старшыня Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен паведаміла, што трэба падрыхтавацца да горшай сітуацыі з газазабеспячэннем у ЕС.

Пазыкі хатніх гаспадарак ЗША перавысілі 17,5 трыльёна долараў

Сукупная запазычанасць хатніх гаспадарак ЗША летась у чацвёртым квартале павялічылася на 1,2 працэнта (на $212 млрд) адносна папярэдніх трох месяцаў і дасягнула рэкордных $17,503 трлн. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні Федэральнага рэзервовага банка (ФРБ) Нью-Ёрка. Сума доўгу адносна кастрычніка — снежня 2022 года ўзрасла на $604 млрд. Пазыкі амерыканцаў па іпатэчных крэдытах павысіліся на $112 млрд у паквартальным параўнанні і дасягнулі $12,2 трлн, па крэдытных картах — на $50 млрд (да $1,13 трлн), па студэнцкіх крэдытах — на $2 млрд (да $1,6 трлн). Запазычанасць па аўтамабільных крэдытах узрасла да $1,61 трлн, падвышальная тэндэнцыя захоўваецца з другога квартала 2020 года, адзначаецца ў паведамленні ФРБ. Доля істотнай пратэрміноўкі плацяжоў (90 дзён і больш) на канец снежня складала 1,42 % супраць 1,03 % на канец 2022-га.

У Нідэрландах выставяць на продаж карціну Ван Гога

Выданне NL Times паведаміла, што карціну Вінцэнта Ван Гога «Партрэт сялянкі ў белым каптуры» ў наступным месяцы выставяць на продаж у Нідэрландах. Пра гэта інфармуюць РІА «Новости». Першапачатковы кошт карціны пакуль не паведамляецца. Палатно «Партрэт сялянкі ў белым каптуры» створана Ван Гогам прыкладна ў 1884 годзе. На думку мастацтвазнаўцаў, дадзеная работа — яркі прыклад ранняга партрэтнага жывапісу сусветна вядомага мастака. Карціну выставяць на продаж на штогадовым кірмашы мастацтва і антыкварыяту Tefaf у нідэрландскім Маастрыхце ў сакавіку, паведамляе NL Times. Ён будзе адкрыты для публікі з 9 да 14 сакавіка.

СТАН БУДЫНКАЎ НА ВЁСЦЫ...

Хвалюе жыхароў Гомельшчыны

На асабісты прыём да старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана КРУПКО звярнуліся жыхары населеных пунктаў Гомельскага раёна, Жлобіна і абласнога цэнтра.

Вяскоўцы Даўгалесся, дзе пражывае каля 540 чалавек, выказваюць занепакоенасць станам мясцовага лазнева-пральнага комплексу, які не працуе з 2016 года.

— Будынак аварыйны, небяспечны, а моладзь там збіраецца, — хвалююцца жыхары Даўгалесся.

— Комплекс вялікі. Неабходна падумаць, як вярнуць яго ў гаспадарчы абарот, — даручыў адказным службам Іван Крупко. — Да гэтага неабходна паклапаціцца аб бяспецы на яго тэрыторыі.

Яшчэ адно пытанне, якое адрасавалі губернатару жыхары Даўгалесся, датычылася работы мясцовага сельскага клуба. Будынак таксама прызнаны аварыйным. Клубныя структуры прапанавана размясціць у будынку ФАПа. Жыхары з гэтым не згодныя. Яны спадзяюцца, што іх ФАП, дзе на абслугоўванні больш за 700 чалавек, перапрафілююць пад амбулаторыю.

Як патлумачыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя аблвыканкама Міхаіл ЗМУШКО,** каб пашырыць у населеным пункце ФАП да амбулаторыі, неабходна павялічыць зону абслугоўвання да 1300 чалавек.

— Пытанне вывучым усебакова. Правядзём абследаванне клуба, прымем рашэнне, — запэўніў вяскоўцаў Іван Крупко.

Жыхары Даўгалесся акрамя таго звярнулі ўвагу кіраўніка рэгіёна на стан дарог у іх населеным пункце. Асаблівыя нараканні вяскоўцаў выклікае дарога на трох вуліцах. Як удакладніў **начальнік галоўнага ўпраўлення ЖКГ аблвыканкама Дзмітрый ЗГУРСКІ**, у планах унесці гэтыя дарогі ў праграму рамонту з уладкаваннем больш дасканалага пакрыцця на 2025—2030 гады. Губернатар даручыў правесці магчымы дарожны рамонт на вёсцы ўжо ў гэтым годзе.

Заяўнік з Гомельскага раёна звярнуўся з просьбай перагледзець графік транспартных зносін паміж Гомелем і вёскай Старая Беліца.

— Каб сёння раніцай прыйсці на прыём, учора прыехаў у Гомель, — паскардзіўся мужчына.

Да абеду з іх вёскі на Гомель вельмі складана дабрацца. У мужчыны цукровы дыябет, і яму часта патрэбна прыязджаць у абласны цэнтр на медабслугоўванне з самай раніцы.

Па тлумачэнні спецыялістаў, перыядычнасць рэйсаў адпавядае патрабаванням сацыяльных стандартаў, але жыхар Старай Беліцы настойвае, што на практыцы ўсё далёка не так. Губернатар даручыў разабрацца, як насамрэч наладжаны транспартныя зносіны з населеным пунктам.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота telegram-канала «Гомельшчына афіцыйна».

Дом, зямля, работа...

Гэтых сфер датычыліся пытанні, якія былі агучаны грамадзянамі на прыёме ў старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ

Магіляўчанін звярнуўся ад імя жыхароў дома па вуліцы Першамайскай з нараканнямі на ўздзеянне ападкаў на іх жылую пабудову. З 2020 года заяўнік неаднаразова агучваў праблему ў розных інстанцыях. Яго заўвагі ўлічваліся, але работы, якія былі праведзены, на думку мужчыны, толькі пагоршылі становішча. І тады ён пайшоў на прыём да губернатара.

Заяўнік лічыць, што трэба было рабіць бетонную аснастку, каб надзейна абараніць дом ад уздзеяння ападкаў. Ён агучыў шэраг прапаноў наконт паляпшэння сітуацыі. Напрыклад, устанавіць водаадводныя латкі, заасфальтаваць пляцоўку перад домам. Гарадскія ўлады прызнаюць праблемы і збіраюцца паставіць дом пад назіранне. Старшыня аблвыканкама пагадзіўся, што трэба на працягу 2,5 месяца правесці маніторынг з фіксацыяй усіх дэфектаў, якія будуць выяўляцца. Ён таксама параіў праводзіць гэтыя мерапрыемствы з удзелам заяўніка.

Шматдзетная сям'я з Магілёва расказала пра сітуацыю з зямельным участкам у Магілёўскім раёне. Дзесяць гадоў таму ён быў выдзелены сужэнцам для будаўніцтва жылога дома для паляпшэння жыллёвых умоў. Мужчына паведаміў, што раней гэты ўчастак апрацоўвалі яго бацькі, якія і паклапаціліся, каб зямля перайшла іх дзецям. Пабудаваць дом адразу не атрымалася, бо не было сродкаў. Пакуль маладыя збіралі іх, магчымасцю пабудавацца скарыстаўся брат заяўніка. Іншай магчымасці пабудаваць сабе асобнае жыллё ў мнагадзетнай сям'і няма. А жывуць сужэнцы з чатырма непаўналетнімі дзецьмі ў адным пакоі.

Старшыня аблвыканкама адзначыў, што пытанне можна вырашыць двума спосабамі: радыкальным і кампрамісным. Пакольку ўчастак належыць заяўнікам, трэба знесці незаконна пабудаваны на ім дом і даць гаспадарам магчымасць правесці законнае будаўніцтва з нуля. Або са сваім праектам і дазвольнымі дакументамі звярнуцца ў банк і адкрыць крэдытную лінію. З улікам таго, што сям'я шматдзетная, яна мае права на салідны сямейны капітал. Гэта дасць магчымасць разлічыцца са сваяком за самабуд і ўзаконіць пабудову. Магілёўскі райвыканкам, у сваю чаргу, паклапоціцца, каб дзеянні шматдзетнай сям'і суправаджаў спецыяліст на прадмет адпаведнасці заканадаўству.

На прыём да губернатара прыйшлі прадстаўнікі азербайджанскай дыяспары. Адзін з іх з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам: меў некалькі гандлёвых месцаў на рынку ў Бабруйску. Але летась дагавор арэнды быў скасаваны за сістэматычнае парушэнне правілаў гандлю, санітарна-эпідэміялагічных нормаў, грамадскага парадку. Заяўнік паведаміў, што гандаль — яго адзіная крыніца даходу і без яе сям'я застаецца без сродкаў да існавання. Да таго ж на яго выхаванні двое непаўналетніх дзяцей.

Падчас прыёму факты шматлікіх парушэнняў беларускага заканадаўства заяўнікам пацвердзілі адпаведныя спецыялісты. На прадпрымальніку дагэтуль некалькі непагашаных штрафаў пачынаючы з 2016 года. Анатоль Ісачанка даў распараджэнне разгледзець пытанне з улікам усіх складнікаў. Ён адзначыў, што мужчыне будзе прапанаваная магчымасць працягнуць работу, але ў поўнай адпаведнасці з заканадаўствам краіны.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Дастойна сустрэць юбілей

Як крочыць у будучыню старажытны Навагрудак

Сёлета горад адзначае 980 гадоў існавання. Праграма абяцае быць насычанай і самабытнай. Але зразумела, што правесці свята без эканамічнага фундамента наўрад ці магчыма. Аб тым, што спрыяе развіццю Навагрудчыны і з чым тут звязваюць далейшы рух наперад, наша размова са старшынёй Навагрудскага райвыканкама Сяргеем ЧАРКОЎСКІМ.

— Сяргей Сяргеевіч, несумненна, сённяшні стан эканомікі выцякае з папярэдняга года. Ці задаволены вы тым, як склаўся сельскагаспадарчы год для раёна?

—— Мінулы год для Навагрудскага раёна склаўся даволі паспяхова. Асноўныя прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна выкананы. Усе выдатна папрацавалі на агульны вынік.

Аграрыі яшчэ раз пацвердзілі, што могуць забяспечыць харчовую бяспеку краіны. У 2023 годзе сельскагаспадарчымі арганізацыямі атрымана больш за 92 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур пры ўраджайнасці амаль 50 цэнтнераў з гектара. Гэта больш, чым у папярэдні год. Парадаваў рапс, якога мы таксама сабралі рэкордны ўраджай. Добра ўрадзілі цукровыя буракі, іх мы атрымалі амаль 73 тысячы тон, каля васьмі тон сабралі бульбы.

У раёне значная ўвага надаецца кармавой базе. Яе таксама нарыхтавана больш, чым у 2022-м. А раён па гэтым паказчыку заняў першае месца ў вобласці. На пачатак снежня ў гаспадарках раёна нарыхтавана 160 тысяч тон кармавых адзінак, што на 5 % больш запасу папярэдняга года. Такім чынам, сёлета на адну ўмоўную жывёлу назапашана 34 цэнтнеры кармавых траў, і гэта самы вялікі аб'ём сярод раёнаў вобласці.

Зразумела, што за ўсімі гэтымі станоўчымі вынікамі і дасягненнямі стаіць вялікая праца людзей, якія любяць сваю зямлю. І вялікі ім за гэта дзякуй. Разам з тым у нас нямала планаў на далейшае развіццё аграрнай галіны.

— Навагрудак — даволі трывалы рэгіён у прамысловым плане. Спажыўцы добра ведаюць многія харчовыя брэнды, у тым ліку малочную, рыбную прадукцыі. Якія прадпрыемствы спрацавалі найбольш удала?

— Станоўчыя вынікі можна адзначыць у сферы вытворчасці, гандлю і паслуг. Аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі ў фактычных цэнах склаў 571 мільён рублёў, індэкс фізічнага аб'ёму вытворчасці — 105,5 %.

Сярод «кітоў» нашай вытворчасці — філіял «Навагрудскія Дары» прадпрыемства «Лідскі малочна-кансервавы камбінат», які забяспечвае 41 % агульнага аб'ёму прамысловасці. У тройку лідараў таксама ўваходзяць Навагрудскі завод газавай апаратуры і сумеснае прадпрыемства «Леор Пластык». Гэта самыя моцныя вытворцы, якія забяспечваюць 85 % усяго аб'ёму прамысловай вытворчасці.

І ў мінулым годзе яны не здалі сваіх пазіцый, а наадварот, умацавалі фінансавае становішча. А два прадпрыемствы — Навагрудскі завод газавай апаратуры і Навагрудскі завод металавырабаў — сталі ўладальнікамі ГРАН-пры міжнароднай бізнес-прэміі «Лідар года — 2023».

Мы маем нядрэнныя экспартныя пазіцыі. Амаль 70 % прадукцыі было адпраўлена ў 17 краін свету. У цэлым экспарт тавараў у раёне склаў 120 мільёнаў долараў ЗША. Па асобных таварных пазіцыях адкрыты новыя рынкі збыту ў такія краіны, як Ірак, Іран і Таджыкістан.

— Як правіла, устойлівая эканоміка дае магчымасць развіваць сацыяльную сферу. У якім кірунку будзе зроблены акцэнт?

— Сёлета будзе зроблены значны крок у медэрнізацыі медыцыны. Пры падтрымцы абласной улады будзем займацца рамонтам паліклінікі, праект ужо распрацаваны. Летась у раёне пачаў дзейнічаць модульны ФАП, у хуткім часе будуць адкрыты яшчэ чатыры.

— Навагрудак славіцца сваёй гісторыка-культурнай спадчынай, у першую чаргу Навагрудскім замкам. Ведаю, што работы па рэстаўрацыі тут вядуцца даволі даўно...

— Зараз на Замкавай гары працягваецца кансервацыя руін трох вежаў XIV—XVI стагоддзяў, а таксама ідзе фарміраванне схілаў. Большая частка гэтых работ зроблена. Магчыма, сёлета пачнецца аднаўленне былой цэнтральнай вежы замка. Яна захавалася лепш за іншыя вежы і з'яўляецца самай пазнавальнай на руінах. Яе плануюць аднавіць поўнасцю і арганізаваць там музейную экспазіцыю. Праект павінен прайсці дзяржаўную экспертызу.

— Раён умацоўвае сяброўскія сувязі з гарадамі-пабратымамі, набывае новых партнёраў. Наколькі шырокі дыяпазон такога супрацоўніцтва і ці ёсць намер прырастаць замежнымі сувязямі?

— Летась мы ў Навагрудку сустракалі дэлегацыі з гарадоў-пабратымаў з нагоды 225-годдзя Адама Міцкевіча. Раздзяліць свята прыехалі прадстаўнікі Велікаболдзінскага муніцыпальнага раёна Ніжагародскай вобласці, муніцыпальнага ўтварэння «Вяземскі раён» Смаленскай вобласці і Светлагорскай гарадской акругі Калінінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

У лістападзе мінулага года падпісана пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх адносін з горадам Дуньхуан правінцыі Ганьсу Кітайскай Народнай Рэспублікі. Сфера дзейнасці шырокая. Гэта і гандлёва-эканамічныя стасункі, і супрацоўніцтва ў галіне культуры, турызму і аховы навакольнага асяроддзя. Зараз мяркуем заключыць дагавор з турэцкай правінцыяй.

— Сёлета Навагрудак адзначае 980-гадовы юбілей. Як плануеце святкаваць? Што цікавага прапануеце месцічам і гасцям горада?

— Праграма абяцае быць вельмі насычанай, з элементамі старажытнасці, адбудзецца фестываль гістарычнай рэканструкцыі з рыцарскімі баямі, гэта заўсёды відовішчна і цікава. Падмацавацца можна падчас гастранамічнага фестывалю. Важнай асаблівасцю стане марафон добрых спраў, у выніку якога кожная арганізацыя зробіць гораду падарунак у выглядзе нейкага аб'екта — гэта можа быць устаноўка дзіцячых атракцыёнаў, лавак, агароджаў, турнікоў, скульптур і гэтак далей. Адбудзецца маладзёжны конкурс відаролікаў «Любімы горад», пройдзе пленэр маладых мастакоў. Лагатып з юбілейнай датай будзе размешчаны на ўпакоўках прадукцыі. У праграме яшчэ шэраг цікавых імпрэзаў.

Знакавай падзеяй стане 80-я гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Традыцыйна будуць рэалізоўвацца праекты і праграмы, прымеркаваныя да святкавання значнай даты ў гісторыі нашай краіны.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Рэгіёны

Найлепшы вынік за дзесяцігоддзе

Віцебская міліцыя расказала, як спрацавала ў мінулым годзе

На прэс-канферэнцыі па выніках 2023 года начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама генерал-маёр міліцыі Андрэй ЛЮБІМАЎ ацаніў работу віцебскіх праваахоўнікаў. Так, аператыўнае становішча летась характарызуецца зніжэннем агульнай колькасці зарэгістраваных злачынстваў, аднак у той жа час павялічылася колькасць кіберзлачынстваў.

«На жаль, але колькасць злачынстваў, якія здзяйсняюцца з прымяненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, павялічваецца і прымае новыя формы. Летась зарэгістравана 1600 такіх злачынстваў, сума шкоды склала больш за два з паловай мільёна рублёў. Дзякуючы аператыўнай рабоце праваахоўнікаў многае ўдалося вярнуць грамадзянам, знізілася колькасць пажылых людзей, пацярпелых ад кіберзлачынстваў. Праводзіцца вялікая прафілактычная работа па павышэнні лічбавай адукаванасці насельніцтва», — адзначыў Андрэй Юр'евіч.

У мінулым годзе праваахоўнікі больш чым на 50 працэнтаў павялічылі колькасць канфіскацый з незаконнага абароту наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх аналагаў (больш за 90 кг). Была перакрыта работа пяці інтэрнэт-крам, пяці каналаў паставак, выяўлена каля дзевяці памяшканняў для вырошчвання высакаякаснай каноплі.

Летась праваахоўнікамі былі раскрыты ўсе забойствы (34), факты прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў (61), згвалтавання (3), разбоі (11), крадзяжы аўтамабіляў (7). У 2023 годзе зменшылася колькасць злачынстваў, якія здзяйсняліся асобамі ў стане алкагольнага ап'янення, іх колькасць летась з'яўляецца адной з найменшых за дзесяцігадовы перыяд. Меры прафілактычнага характару дазволілі знізіць колькасць зарэгістраваных дарожна-транспартных здарэнняў, а таксама загінулых у іх грамадзян. З 2013 года на Віцебшчыне зарэгістраваны самыя нізкія паказчыкі аварыйнасці.

У галіне эканамічных злачынстваў праваахоўнікі паўночнага рэгіёна таксама спрацавалі на высокім узроўні: выяўлена каля 400 такіх фактаў па лініі БЭЗ, больш за 100 з іх — карупцыйнага кірунку. Вялікая ўвага была аддадзена аграпрамысловаму комплексу: выяўлены факты сістэмных крадзяжоў збожжавых культур ураджаю мінулага года з боку службовых асоб сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Дубровенскага і Полацкага раёнаў, канфіскавана каля 600 тон збожжа.

У мінулым годзе матэрыяльна-тэхнічная база УУС папоўнілася 73 аўтамабілямі, па дзяржаўнай праграме будаўніцтва арэнднага жылля ў паўночным рэгіёне для супрацоўнікаў міліцыі будуецца 181 кватэра, скончана будаўніцтва 27.

У 2024 годзе віцебская міліцыя плануе далей укараняць рэспубліканскую сістэму маніторынгу грамадскай бяспекі, цяпер на тэрыторыі вобласці ўсталявана і функцыянуюць больш за 4,5 тысячы відэакамер. З іх дапамогай летась раскрыта 55 злачынстваў, установлена 28 асоб, якія знаходзяцца ў вышуку за здзяйсненне злачынстваў, і тры асобы, якія зніклі без вестак. Плануецца набыццё квадракоптараў з мэтай рознага віду відэафіксацыі, у тым ліку ў галіне дарожнай бяспекі.

Адна з асноўных задач на бягучы 2024 год — падтрымка высокай гатоўнасці да забеспячэння правапарадку, грамадскай і дарожнай бяспекі пры правядзенні грамадска-палітычных, культурна-масавых і міжнародных мерапрыемстваў. Цяпер увага віцебскай міліцыі накіравана ў тым ліку на арганізацыю грамадскай бяспекі і правядзенне на высокім узроўні электаральнай кампаніі. Усе выбарчыя ўчасткі вобласці абсталяваны камерамі відэаназірання, на кожным будуць несці кругласутачную службу праваахоўнікі. Заступаць на варту грамадскага спакою рыцдзвінскія праваахоўнікі рыхтуюцца і падчас «Славянскага базару», XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, святкавання 1050-годдзя Віцебска.

«Прынятыя меры ў мінулым годзе дазволілі віцебскай міліцыі не дапусціць ускладнення аператыўнага становішча, забяспечыць ахову правапарадку і высокі ўзровень грамадскай бяспекі. Кастрычніцкі РАУС горада Віцебска і Расонскі аддзел прызнаны найлепшымі ў краіне. Гэта паказчык высокага даверу з боку насельніцтва і заслужанага аўтарытэту праваахоўных органаў», — заключыў Андрэй Любімаў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Пакупкі з сэнсам

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэцім фактарам стане пашырэнне асартыменту тавараў і паслуг, даступных для пакупкі ў інтэрнэце, у тым ліку ў сферах, што традыцыйна асацыіруюцца з афлайн-пакупкамі, такіх як прадукты харчавання, адзенне, касметыка, мэбля і іншыя. Як толькі апісанне тавару (яго аб'ёмныя фота і відэаверсія) будзе ўспрымацца патэнцыяльнымі пакупнікамі як рэальнасць, неэлектронныя крамы будуць губляць сваіх кліентаў сямімільнымі крокамі.

Чацвёрты фактар — паляпшэнне якасці і хуткасці дастаўкі, а таксама прадстаўленне розных опцый для выбару пакупнікоў, такіх як самастойны вываз, кур'ерская дастаўка і дастаўка ў дзень заказу.

У пяцёрку ўвайшоў рост папулярнасці маркетплейсаў, якія прапаноўваюць пакупнікам шырокі выбар тавараў і паслуг ад розных прадаўцоў. Тут жа вам прапануюць дадатковыя сэрвісы, такія як рэкамендацыі, водгукі, гарантыі і многае іншае.

Яшчэ адным фактарам будзе ўкараненне новых тэхналогій і інавацый, што паляпшаюць карыстальніцкі досвед, павышаюць канверсію і лаяльнасць пакупнікоў, а таксама аптымізуюць працэсы прадаўцоў. Гэта можа быць, напрыклад, штучны інтэлект, блокчэйн, віртуальная і дапоўненая рэальнасць, інтэрнэт рэчаў і сацыяльная камерцыя.

Такім чынам, можна чакаць, што рынак электроннай камерцыі працягне расці і развівацца ў 2024 годзе, даючы прадаўцам і пакупнікам новыя магчымасці і перавагі. А як рынак e-commerce апошнія некалькі гадоў? Што на гэта ўплывала?

МАРКЕТПЛЕЙСЫ — ЯК НОВАЯ ЭРА

Гэта замежнае слова можна замяніць на ўжо знаёмы гіпермаркет, дзе на адной пляцоўцы знаходзяцца розныя прадаўцы (пастаўшчыкі), і пакупнікі могуць рабіць пакупкі ў розных крамах, знаходзячыся ў адным асяроддзі.

Папулярнасць маркетплейсаў прыйшла да нас некалькі гадоў таму і працягвае нарошчваць сваю прысутнасць у нашым жыцці. Платформы збіраюць тавары і паслугі ад розных прадаўцоў, а пакупнікі могуць параўноўваць і выбіраць найбольш прыдатныя для сябе варыянты. Па звестках інфармацыйных агенцтваў, у 2023 годзе доля маркетплейсаў у аб'ёме продажаў у грашовым выражэнні ў Расіі склала 47 %, што на 14 % больш, чым у 2022 годзе. У свеце маркетплейсы займаюць больш за 50 % рынку электроннага гандлю, а ў 2024 годзе гэты паказчык можа дасягнуць 67 %.

Маркетплейсы прыцягваюць прадаўцоў і пакупнікоў сваімі перавагамі. Для прадаўцоў гэта магчымасць атрымаць доступ да вялікай аўдыторыі патэнцыяльных кліентаў, знізіць выдаткі на маркетынг і лагістыку, а таксама павялічыць сваю канкурэнтаздольнасць. Для пакупнікоў гэта зручнасць пошуку і параўнання тавараў, шырокі выбар і нізкія цэны, а таксама гарантыі якасці і бяспекі здзелак.

Аднак маркетплейсы таксама ставяць перад прадаўцамі і пакупнікамі новыя задачы і праблемы. Прадаўцам даводзіцца канкураваць не толькі з іншымі селерамі на адной платформе, але і з самімі маркетплейсамі, якія могуць запускаць уласныя брэнды або аддаваць перавагу пэўным партнёрам. Пакупнікам жа складана арыентавацца ў велізарным асартыменце тавараў, адрозніваць сапраўдныя ад падробак, а таксама даверяць водгукам і рэйтынгам прадаўцоў.

Таму такія гандлёвыя пляцоўкі пастаянна працуюць над паляпшэннем карыстальніцкага досведу, укараняючы новыя тэхналогіі і сэрвісы. Напрыклад, многія з іх выкарыстоўваюць штучны інтэлект для персаналізацыі кантэнту, рэкамендацый тавараў, аналітыкі даных, аптымізацыі цэн і дастаўкі. Распаўсюджваюцца такія практыкі, як пошук па фота ці голасе, віртуальная або дапоўненая рэальнасць, сацыяльны шопінг, гейміфікацыя і іншыя.

Найбуйнейшымі маркетплейсамі нашай краіны з'яўляюцца: 1. Wildberries, 2. Ozon, 3. «Яндэкс. Маркет», 4. AliExpress, 5. Deal.by, 6. Onliner.by, 7. Shop.by, 8. 1k.by, 9. Pulscen.by, 10. Tomas.by, 11. Unishop.by, 12. Kufar.by.

УСЁ АДРАЗУ

Яшчэ адным важным драйверам рынку электроннага гандлю да гэтага часу застаецца амніканальнасць-стратэгія, пры якой прадавец дае пакупніку магчымасць узаемадзейнічаць з ім праз розныя каналы камунікацыі і продажаў. Яны могуць быць такія як сайт, мабільны дадатак, сацыяльныя сеткі, месенджары, афлайн-крамы, пункты выдачы і іншыя. Пры гэтым усе каналы інтэграваны паміж сабой.

Амніканальнасць адказвае на запыты сучасных спажыўцоў, якія хочуць атрымліваць інфармацыю аб таварах і паслугах у любы час і ў любым месцы, а таксама мець магчымасць выбіраць найбольш зручны для сябе спосаб пакупкі і дастаўкі. Па даных даследавання аналітычных агенцтваў, амніканальныя пакупнікі траціць у сярэднім на 4 % больш у афлайн-крамах і на 10 % больш у анлайн-крамах, чым тыя, хто карыстаецца толькі адным каналам. Акрамя таго, амніканальныя пакупнікі больш лаяльныя да брэнда і часцей паўтараюць пакупкі.

Для прадаўцоў амніканальнасць уяўляе сабой не толькі спосаб задаволіць патрэбы кліентаў, але і інструмент для павышэння эфектыўнасці бізнесу. Дзякуючы амніканальнасці прадаўцы могуць збіраць і аналізаваць даныя аб паводзінах і перавагах пакупнікоў, паляпшаць свае прадукты і сэрвісы, а таксама аптымізаваць свае выдаткі і даходы. Напрыклад, прадаўцы могуць выкарыстоўваць афлайн-крамы як шоўрумы для дэманстрацыі тавараў, а таксама як пункты выдачы для анлайн-заказаў, што зніжае выдаткі на арэнду і дастаўку.

Амніканальны падыход з'явіўся, калі ўладальнік бізнесу стаў на бок сучаснага карыстальніка. Колькасць інфармацыі і каналаў зашкальвае, часу на камунікацыю ўсё менш. Наш мозг проста не гатовы прыняць сітуацыю, калі пры куплі трэба здзяйсняць лішнія дзеянні. Амніканальнасць робіць з брэнда памочніка, які нябачнай рукой вядзе карыстальніка да завяршэння здзелкі і выклікае пры гэтым станоўчыя эмоцыі.

Аднак амніканальнасць таксама патрабуе ад прадаўцоў вялікіх намаганняў і інвестыцый у стварэнне і падтрыманне адзінай інфраструктуры, сістэмы кіравання і кантролю якасці для ўсіх каналаў. Таксама прадаўцам неабходна ўлічваць спецыфіку і асаблівасці кожнага канала, адаптаваць сваю прапанову і камунікацыю да яго, а таксама забяспечваць узгодненасць свайго брэнда і паведамленні ў розных каналах.

Амнікальнасць — гэта аб'яднанне каналаў у адзіную сістэму, праз якую карыстальніку зручна ўзаемадзейнічаць з брэндам. Паводле даследавання CMI, 59 % пакупнікоў развітваюцца з кампаніяй пасля некалькіх негатыўных камунікацый, а 17 % — ужо пасля першага няўдалага кантакту. Добры мабільны дадатак, зручны сайт, добразычлівы кол-цэнтр і дружалюбныя сацыяльныя сеткі падымуць сэрвіс на новы ўзровень, калі паміж імі будзе настроена ўзаемасувязь.

САЦЫЯЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Яшчэ адным фактарам, які ўплывае на рашэнні прадаўцоў і пакупнікоў на рынку электроннага гандлю, з'яўляецца сацыяльная адказнасць. Пад гэтым разумеецца ўлік экалагічных, сацыяльных і этычных аспектаў дзейнасці кампаніі, а таксама яе ўклад у вырашэнне глабальных праблем, такіх як змяненне клімату, няроўнасць, беднасць і іншае. Сацыяльная адказнасць становіцца ўсё больш важнай для сучасных спажыўцоў, асабліва для маладога пакалення, якое хоча бачыць за сваімі пакупкамі не толькі цану і якасць, але і сэнс і каштоўнасць. Нездарма нават у побыце існуе выраз «галасаваць рублём».

Па звестках даследавання найбуйнейшых экспертаў, 73 % спажыўцоў па ўсім свеце гатовыя змяніць свае звычкі спажывання на карысць больш устойлівых тавараў і паслуг. А па даных CMI, 71 % расіян лічаць, што кампаніі павінны дзейнічаць у інтарэсах грамадства, а не толькі сваіх акцыянераў.

Для прадаўцоў сацыяльная адказнасць уяўляе сабой не толькі выклік, але і магчымасць. Прадаўцы павінны ўлічваць патрабаванні і чаканні сваіх кліентаў. Яны павінны таксама прытрымлівацца заканадаўства і стандартаў у галіне экалогіі, сацыяльнай сферы і карпаратыўнай этыкі. Акрамя таго, прадаўцы могуць выкарыстоўваць сацыяльную адказнасць як інструмент для павышэння сваёй рэпутацыі, дыферэнцыяцыі сваёй прапановы, умацавання сувязі з кліентамі і партнёрамі, а таксама для стымулявання інавацый і аптымізацыі сваіх працэсаў.

Многія прадаўцы ўжо дэманструюць сваю сацыяльную адказнасць на рынку электроннага гандлю. Напрыклад, некаторыя з іх прапаноўваюць сваім пакупнікам магчымасць выбіраць экалагічную ўпакоўку, дастаўку без выкідаў вугляроду, вяртанне і перапрацоўку старых тавараў, а таксама ахвяраваць частку сумы пакупкі на дабрачыннасць. Некаторыя прадаўцы падтрымліваюць сацыяльныя праекты, накіраваныя на дапамогу маламаёмасным, малому бізнесу, адукацыі, ахове здароўя і іншым сферам.

Сяргей КУРКАЧ.

ПУХЛІНЫ ЎЗНІКАЮЦЬ НЕ ПРОСТА ТАК

Анколаг аб небяспецы абыякавасці да свайго здароўя і неабходнасці абследавацца

Злаякасныя новаўтварэнні, як і многія іншыя захворванні, вядомыя яшчэ са старажытных часоў. Самай старажытнай лічыцца пухліна, выяўленая ў шкілеце дыназаўра. Пры даследаванні мумій Старажытнага Егіпта ў адным выпадку былі выяўлены прыкметы раку яечнікаў, у іншым — злаякаснае паражэнне чэрапа.

Злаякасная пухліна — гэта аўтаномнае, аўтадынамічнае разрастанне тканак, якія нясуць у сваіх клетках стымул для разбуральнага або агрэсіўнага хаатычнага росту.

У прыродзе ўсе жывыя істоты складаюцца з клетак, якія з'яўляюцца, адпрацоўваюць належны ім тэрмін і паміраюць. У арганізме чалавека прысутнічае два механізмы іх гібелі. Апаптоз — генетычна запраграмаваная фізіялагічная гібель клетак, пры гэтым запаленне вакол клеткі адсутнічае. Гэта працэс знішчэння непатрэбных клеткавых груп у перыяд індывідуальнага развіцця, які суправаджаецца зморшчваннем і фрагментацыяй структуры ядра клеткі. Другі механізм гібелі клеткі — некроз, г. зн. паталагічная масавая гібель клетак, «смерць ад няшчаснага выпадку», і маюцца запаленчыя змены вакол ачагу некрозу. Некроз назіраецца пры вонкавых уздзеяннях у выглядзе рэзкага набракання або разбурэння клеткавых структур. Праява некрозу вызначаецца яго сутнасцю: «мясцовай смерцю» зон некрозу, важных для арганізма органаў чалавека — інфаркт, інсульт і інш. Такім чынам, галоўнае адрозненне некрозу ад апаптозу ў тым, што апаптоз — праграмаваная гібель клеткі, а некроз — паталагічны працэс, які запускаецца ў адказ на вонкавыя ці ўнутраныя ўздзеянні.

Але, на вялікі жаль, існуе яшчэ адзін шлях развіцця клетак, самы страшны і не заўсёды прадказальны. У кожнай жывой істоты ў арганізме перыядычна ўзнікаюць атыповыя клеткі, якія адрозніваюцца ад нармальных. Гэтыя клеткі заўважае імунная сістэма і знішчае іх. Але часам па нейкіх прычынах такая клетка не гіне, і тады ўзнікае пухліна, калі адна такая або некалькі клетак выходзяць з-пад кантролю арганізма і пачынаюць паскорана хаатычна дзяліцца і размнажацца. Пры гэтым ужо ні нервовая, ні эндакрынная, ні імунная сістэмы справіцца з такімі клеткамі не могуць.

Працэс выхаду клеткі з-пад кантролю арганізма называецца пухліннай трансфармацыяй. Ракавыя клеткі бескантрольна дзеляцца, затрачваючы вялікую колькасць энергіі. У структуры пухліны могуць быць разнастайныя па будове клеткі. Яны губляюць частку прыкмет і становяцца падобнымі на зародкавыя клеткі. Гэтыя клеткі часам страчваюць здольнасць да ціснага счаплення з суседнімі клеткамі, могуць адлучацца ад іх і пераносіцца ў іншыя часткі цела і органы, даючы пачатак узнікненню і развіццю новых пухлін, г. зн. метастазіраваць.

Але ў большасці сваёй пухліны проста так не ўзнікаюць. Для з'яўлення пухліны неабходныя ўнутраныя прычыны: генетычная схільнасць, пэўны стан імуннай сістэмы і знешнія фактары: механічныя, фізічныя, хімічныя, біялагічныя канцэрагены (рэчывы ад лацінскай назвы cancer — «рак»). Працэс ператварэння нармальных клетак у злаякасныя называецца канцэрагенез. Калі чалавек нічога не робіць, то пухліна хутка разрастаецца, захоплівае іншыя органы і тканкі і прыводзіць да пакутлівай смерці.

Большасць пухлін 1-й і 2-й стадый выяўляецца на медыцынскіх аглядах

Такім чынам, рак — гэта цяжкая хвароба, але ў цяперашні час яна вылечваецца ў 100 % выпадкаў у пацыентаў у 1-й і 2-й стадыях. Што да хворых у 3-й і 4-й стадыі, прагноз на жыццё ў іх практычна неспрыяльны. Ім можна часова дапамагчы толькі ў плане стабілізацыі ракавага працэсу на пэўны перыяд і палепшыць якасць жыцця.

У кожнай жывой істоты ў арганізме перыядычна ўзнікаюць атыповыя клеткі, якія адрозніваюцца ад нармальных. Гэтыя клеткі заўважае імунная сістэма і знішчае іх. Але часам па нейкіх прычынах такая клетка не гіне, і тады ўзнікае пухліна, калі адна такая або некалькі клетак выходзяць з-пад кантролю арганізма і пачынаюць паскорана хаатычна дзяліцца і размнажацца. Пры гэтым ужо ні нервовая, ні эндакрынная, ні імунная сістэмы справіцца з такімі клеткамі не могуць.

Таму выйсце ў нас адно ў плане недапушчэння развіцця раку ў арганізме. Ён вельмі каварны і на пачатковых стадыях працякае бессімптомна, а выявіць яго ў ранніх стадыях магчыма, калі рэгулярна праходзіць прафілактычныя агляды ў медыцынскіх установах агульналячэбнай сеткі. І не трэба ўнушаць самому сабе ў першую чаргу, што нідзе не баліць, моцная загружанасць на працы і інш. Гэта проста банальныя адгаворкі, якія могуць прывесці да цяжкіх наступстваў (раку), калі сучасная медыцына ўжо не ў стане дапамагчы. Задумайцеся над гэтым сур'ёзна! А ўсяго толькі трэба зрабіць аналізы крыві на анкамаркеры, рэнтгенаграфію лёгкіх, УГД органаў брушнай поласці і забрушыннай прасторы, фібрагастраскапію (ФГДС) страўніка, калананаскапію тоўстага кішэчніка.

І калі ва ўрачоў, якія праводзяць абследаванне здаровых людзей на медыцынскіх аглядах, узнікаюць нейкія падазрэнні, то гэты чалавек трапляе ў так званую групу рызыкі. Такія пацыенты надалей праходзяць дэталёвае абследаванне ў анкалагічных дыспансерах краіны. Дыягнастычныя магчымасці ў анкалагічных установах дазваляюць выявіць перадпухліны стан і пухліны малых памераў. Дарэчы, асноўная маса пухлін 1-й і 2-й стадыі выяўляецца менавіта пры медыцынскіх аглядах. Наш Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава валодае суперсучаснымі дыягнастычнымі апаратамі для дыягностыкі раку і яго распаўсюджанасці па арганізме, што дазваляе ўстанавіць дыягназ у самых складаных выпадках.

У цэнтры распрацаваны і прымяняюцца ўнікальныя метады лячэння, якія не маюць аналагаў у краінах СНД і свеце. Што да лячэбнай базы для правядзення комплекснай і камбінаванай тэрапіі, у структуры цэнтра ёсць чатыры аддзяленні прамянёвай тэрапіі, тры аддзяленні хіміятэрапіі і 11 хірургічных аддзяленняў.

РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава займае адно з вядучых месцаў у краінах СНД, а па некаторых пазіцыях — і ў свеце. Як вынік, на базе нашага цэнтра праходзяць стажыроўку ўрачы з краін СНД (Расія, Казахстан, Узбекістан, Азербайджан, Кыргызстан) і краін Блізкага Усходу. Аб папулярнасці цэнтра сведчыць і той факт, што на лячэнне да нас едзе вялікая колькасць пацыентаў як з блізкага, так і далёкага замежжа. Лічу, што нашым грамадзянам, маючы ў сваёй краіне ўнікальную магчымасць лячыцца на ўзроўні сусветных стандартаў, бессэнсоўна ехаць лячыцца за мяжу, гэта пустая трата грошай.

Мы, медыкі, у сваёй рабоце вырашаем у асноўным тактычныя задачы. Але наўрад ці мы мелі б такія магчымасці ў дыягностыцы і лячэнні анкалагічных пацыентаў у Рэспубліцы Беларусь, калі б Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка не рэалізаваў шматпланавую стратэгію адносна аховы здароўя. Што я маю на ўвазе? Па-першае, толькі дзякуючы Прэзідэнту пабудавана вялікая колькасць сучасных, якія не саступаюць сусветнаму ўзроўню, будынкаў для лячэбных устаноў. Толькі ў нашым цэнтры за апошні час пабудавана пяць спецыялізаваных камфартабельных будынкаў і рэканструявана яшчэ тры карпусы. Па-другое, толькі дзякуючы Прэзідэнту медыцына атрымала вялікую колькасць суперсучаснай дыягнастычнай апаратуры і цяжкай лячэбнай тэхнікі для абследавання і лячэння пацыентаў.

Па-трэцяе, нашы супрацоўнікі ў розны час за кошт дзяржавы маглі прайсці стажыроўку ў вядучых медыцынскіх цэнтрах свету. Цяпер яны плённа працуюць і навучаюць медыцынскіх работнікаў, якія прыехалі да нас з іншых краін. Анкалогія — вельмі затратная галіна не толькі ў медыцыне, але і ў краіне. Лекавыя прэпараты розных груп і класаў каштуюць вялізных грошай. Прэзідэнт вырашыў і гэту праблему. Фармацэўтычная прамысловасць перабудавалася і стала вырабляць вялікую колькасць цытастатыкаў, гармонаў, імунамадулятараў і інш. Аналагі імпартных прэпаратаў, якія выпускаюцца ў краіне, нашмат таннейшыя, а па эфектыўнасці ў плане лячэння не саступаюць імпартным.

У большасці сваёй пухліны проста так не ўзнікаюць. Для з'яўлення пухліны неабходныя ўнутраныя прычыны: генетычная схільнасць, пэўны стан імуннай сістэмы і знешнія фактары: механічныя, фізічныя, хімічныя, біялагічныя канцэрагены (рэчывы ад лацінскай назвы cancer — «рак»).

Такім чынам, усе мы павінны зразумець і засвоіць, што за наша здароўе мы нясём адказнасць у першую чаргу перад самім сабой, сваёй сям'ёй, грамадствам. Не пайшоў на медыцынскі агляд адзін раз, другі, з'явілася пухліна, і чалавек пра гэта не ведае. Пухліна паступова з'ядае арганізм, нарастаюць сімптомы інтаксікацыі, становіцца цяжка жыць і працаваць. Пацыент ідзе да ўрача, а там ужо рак, які далёка зайшоў і бачны доктару няўзброеным вокам. І рабіць нешта ўжо позна з-за нядбайнага стаўлення да свайго здароўя. Я не запалохваю, а папярэджваю, якая можа скласціся жыццёвая сітуацыя.

Сям'я таксама пакутуе — маральна, матэрыяльна, фізічна ад гора, якое прыйшло да іх. Чалавек працаваў, прыносіў карысць, быў запатрабаваны ў калектыве, а з-за абыякавага стаўлення да свайго здароўя становіцца інвалідам. Грамадства павінна яго ўтрымліваць, даваць групу інваліднасці... Фактычна чалавек сам давёў сябе да такога стану, не сачыў за сваім здароўем. А дзяржава магла выдаткаваць гэтыя грошы на будаўніцтва школ, устаноў і іншыя карысныя для людзей аб'екты, ці на паляпшэнне дабрабыту грамадства.

Людзі! Змяняйце стаўленне да свайго здароўя і будзьце больш арганізаваныя і адказныя!

Анкалагічны музей стане ўнікальным на постсавецкай прасторы

Я прапрацаваў у анкалогіі каля 50 гадоў, з іх 32 — на пасадзе намесніка дырэктара па лячэбнай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Станаўленне, развіццё анкалагічнай службы краіны праходзіла на маіх вачах і пры маім удзеле. Выяўлены кантраст таго, што было раней і якіх вышынь дасягнула анкалогія да цяперашняга часу ў Рэспубліцы Беларусь, садзейнічаў з'яўленню ў мяне думкі аб стварэнні музея анкалагічнай службы ў нашай краіне. Музей такога профілю з'яўляецца першым праектам у краіне і на постсавецкай прасторы.

Статыстыка кажа, што да 2030 года кожны 25-ы жыхар Беларусі будзе захворваць на рак. Такая тэндэнцыя характэрная для большасці краін свету. Актуальнасць музея на сучасным этапе абумоўлена пастаянным ростам захваральнасці насельніцтва Беларусі на злаякасныя новаўтварэнні і ў той жа час разуменнем, якое ўсё больш пашыраецца ў грамадстве, што сёння «рак — не прыгавор, а дыягназ, сур'ёзны і небяспечны». Пры абмеркаванні маёй ідэі аб стварэнні такога музея на базе цэнтра з яго дырэктарам, прафесарам, доктарам медыцынскіх навук Сяргеем Львовічам Паляковым, урачамі, якія працуюць працяглы час у анкалогіі, была падтрымана мэтазгоднасць і неабходнасць гэтага праекта. Я далажыў міністру аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Дзмітрыю Леанідавічу Піневічу і губернатару Мінскай вобласці Аляксандру Генрыхавічу Турчыну (цэнтр знаходзіцца на тэрыторыі Мінскага раёна) аб ідэі стварэння музея анкалагічнай службы Рэспублікі Беларусь. Яны падтрымалі прапанову і абяцалі ўсялякую дапамогу ў стварэнні музея і рэканструкцыі будынка. Таксама абмеркаваў гэтую ідэю з губернатарам Гродзенскай вобласці Уладзімірам Сцяпанавічам Каранікам, які доўгі час працаваў у анкалогіі і добра ведае гэтую службу. Ён пацвердзіў, што такі музей патрэбны і ён будзе садзейнічаць яго стварэнню. Дарэчы, Гродзенская вобласць ужо аказала пасільную спонсарскую дапамогу для рэканструкцыі будынка будучага музея.

Зыходзячы з сацыяльнай значнасці праблемы, якая ўяўляе сабой сур'ёзную пагрозу для дэмаграфічнай бяспекі краіны, музей, які ствараецца, будзе арыентаваны на шырокую аўдыторыю. Натуральна, што рэканструкцыя будынка і стварэнне яго ўнутранага інтэр'ера будуць весціся на спонсарскія грошы. Таму анколагі звяртаюцца да ўсіх кіраўнікоў устаноў і проста грамадзян нашай краіны аказаць па магчымасці спонсарскую дапамогу ў гэтым высакародным мерапрыемстве.

Музей стане інфармацыйна-адукацыйным ядром комплекснага ўяўлення аб гісторыі і сучасным стане анкалагічнай дапамогі, фарміраванні прывабнага іміджу айчыннай аховы здароўя, выхавання ў маладога пакалення пачуцця гонару, патрыятызму і жадання ўмацоўваць, захоўваць і памнажаць шматгадовыя традыцыі і дасягненні анкалагічнай службы на карысць здароўя.

Анатоль МАЎРЫЧАЎ,
заслужаны ўрач
Рэспублікі Беларусь,
доктар медыцынскіх навук,
прафесар.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Мётча Агро»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Ноутбук Acer, инв. № 44674	4,14	0,41	0,21
2	USB флеш-накопитель VERBATIM, № 68107	0,60	0,06	0,03
3	Монитор Samsung SyncMaster 795df, № 10458	0,30	0,03	0,02
4	Прибор «Алкотест-203» компл., № 2134	8,40	0,84	0,42
5	Принтер Samsung ML-1520H, № 2404	3,24	0,32	0,16
6	Стол 1500*850*740, № 59947	3,54	0,35	0,18
7	Стол компьютерный прямой, № 58305, 2 шт.	2,40	0,24	0,12
8	Стол компьютерный угловой, № 58306, 2 шт.	1,20	0,12	0,06
9	Телефонный аппарат Panasonic KX-TS 2365 RU, № 59055	3,66	0,37	0,18
10	Тумба-стол 2000*800*600, № 60159	2,16	0,22	0,11
11	Шкаф книжный, № 2474	0,90	0,09	0,05
12	Шкаф плательный 2100*850*400, № 59930	0,84	0,08	0,04
13	Шкаф СШ-010,02(01), № 66857	9,00	0,90	0,45
14	Халат женский р. 48-50, № 68048, 4 шт.	0,96	0,10	0,05
15	Халат женский р. 52-54, № 68049, 2 шт.	0,48	0,05	0,02
16	Халат женский р. 52-54, № 68049, 16 шт.	3,84	0,38	0,19
17	Халат женский р. 56-58, № 68053, 9 шт.	2,16	0,22	0,11
18	Халат женский р. 60-62, № 68051, 7 шт.	1,68	0,17	0,08
19	Сушилка СБВС-5,01, инв. № 3233	3738,00	373,80	186,90
20	Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-13137 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – контора, общая площадь – 1230,4 кв. м)	27 690,00	2 769,00	1 384,50
21	Витрина холодильная «Двина-120», инв. № 2218	43,20	4,32	2,16
22	Витрина холодильная «Двина-120», инв. № 2219	43,20	4,32	2,16
23	Витрина холодильная «Двина-150», инв. № 2207	31,20	3,12	1,56
24	Витрина холодильная «Двина-150», инв. № 2279	31,20	3,12	1,56
25	Витрина холодильная БПСН 1800, инв. № 1195	19,20	1,92	0,96
26	Витрина холодильная ВХЗ-1511,02, инв. № 1198	19,20	1,92	0,96
27	Холодильная витрина «Двина-150», инв. № 213	31,20	3,12	1,56
28	Электростанция HERMANHAE 121, инв. № 1435	84,00	8,40	4,20

В отношении лотов №№ 1–18 проводятся девятые повторные торги. **Стоимость снижена на 95 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29949) от 12.04.2023, стр. 15, № 103 (29983) от 01.06.2023, стр. 11, № 125 (30005) от 01.07.2023, стр. 6, № 141 (30021) от 25.07.2023, стр. 14, № 185 (30065) от 23.09.2023, стр. 15, № 222 (300952) от 16.11.2023, стр. 4, № 237 (300967) от 07.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 10, № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14. В отношении лота № 19 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 185 (30065) от 23.09.2023, стр. 15, № 222 (300952) от 16.11.2023, стр. 4, № 237 (300967) от 07.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 10, № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14. В отношении лота № 20 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 204 (30084) от 20.10.2023, стр. 14, № 237 (300967) от 07.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 10, № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14. В отношении лотов №№ 21–27 проводятся девятые повторные торги. **Стоимость снижена на 90 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29949) от 12.04.2023, стр. 15, № 103 (29983) от 01.06.2023, стр. 11, № 125 (30005) от 01.07.2023, стр. 6, № 141 (30021) от 25.07.2023, стр. 14, № 185 (30065) от 23.09.2023, стр. 15, № 222 (300952) от 16.11.2023, стр. 4, № 237 (300967) от 07.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 10, № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14. В отношении лота № 28 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29949) от 12.04.2023, стр. 15, № 103 (29983) от 01.06.2023, стр. 11, № 125 (30005) от 01.07.2023, стр. 6, № 141 (30021) от 25.07.2023, стр. 14, № 185 (30065) от 23.09.2023, стр. 15

Местонахождение лотов №№ 1–19, 21–28: Минская обл., Борисовский р-н, Мётченский с/с, вблизи д. Старая Мётча. GPS-координаты: 54.179354, 28.711073.
Местонахождение лота № 20: Минская обл., Борисовский р-н, Мётченский с/с, д. Большая Ухолода, ул. Элькинда Виктора, 18

Лот № 20 расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884802101000733 площадью 0,5361 га, для строительства и обслуживания конторы. Право аренды до 08.01.2073. Имеются ограничения (обременения) на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 84 га, ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), код – 2,7, площадь – 0,5361 га

Дата и время проведения торгов	**20 февраля 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 8 февраля 2024 года до 16.00 16 февраля 2024 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Мётча Агро», проводимых 20.02.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Информация о продавце	**ООО «Мётча Агро» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293110464, 80173958917 (Минская обл., Борисовский р-н, Мётченский с/с, д. Старая Мётча, ул. Почтовая, д. 1, УНП 190564818)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 13 марта 2024 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	- Изолированное помещение с инв. № 320/D-34606 общей площадью 2986,1 кв. м, наименование: изолированное помещение № 3; назначение: производственное помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-3. - Изолированное помещение с инв. № 320/D-34608 общей площадью 3020,3 кв. м, наименование: изолированное помещение № 4; назначение: складское помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-4. - Изолированное помещение с инв. № 320/D-34609 общей площадью 894,4 кв. м, наименование: изолированное помещение № 5; назначение: складское помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-5. - Капитальное строение, инв. № 320/С-40378 общей площадью 780,4 кв. м, наименование: участок автодорог для обслуживания помещений ГПК, назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, составные части и принадлежности: А-автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, Б-автодороги, въезды с бетонным покрытием расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1, участок 4. Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100003009697 площадью 0,2012 га. - Капитальное строение инв.№ 350/С-40379 общей площадью 577,1 кв. м, наименование: участок автодорог для обслуживания помещений ГПК, назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, составные части и принадлежности: А-автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, Б-автодороги, въезды с бетонным покрытием, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1, участок 5. Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100003009698 площадью 0,1531 га. Емкость для латекса (инв. № 142-6030); емкость для латекса (инв. № 142-6031); емкость для латекса (инв. № 142-6032); емкость для латекса (инв. № 142-6033); емкость для латекса (инв. № 142-6034); емкость для латекса (инв. № 142-6035); емкость для латекса (инв. № 142-6036); емкость для латекса (инв. № 142-6037); емкость для латекса (инв. № 142-6038, 1980 год выпуска); ограждение промплощадки 36,30 п. м (9 плит) (инв. 120-2019-8); ограждение промплощадки 56,70 п. м (14 плит) (инв. 120-2019-7); шпалы железобетонные б/у, 4 штуки (инв. № 9993312727); шпалы деревянные б/у, 207 (инв. № 9993312728); рельсы Р-65 б/у, 247,54 метра (инв. 9993317675)	**2 126 255,16**	212 625,52

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07 – заместитель директора по техническим вопросам Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 февраля 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11 марта 2024 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Информация об аукционе размещена на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(Организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Селевцы»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже

ЗДАНИЯ КОТЕЛЬНОЙ

с инв. № 630/С-42625
общей площадью 989,3 кв. м

(составные части и принадлежности: мазутонасосная, металлическая трансформаторная подстанция, 2 резервуара смешанной конструкции, металлический мазутослив, дымовая труба с дымоходом смешанной конструкции, асфальтобетонное покрытие, 4 металлической емкости, кирпичный бункер мокрого хранения соли, водопроводная сеть протяженностью 270,6 кв. м, канализационная сеть протяженностью 176,8 кв. м, ливневая канализация протяженностью 320,9 кв. м, тепловая сеть протяженностью 26,0 кв. м, газопровод протяженностью 190,5 кв. м, линия освещения протяженностью 248,9 кв. м),
расположенного на земельном участке площадью 1,6196 га с кадастровым номером 623850100003002673 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 31К.

На территории земельного участка расположены подземные кабельные ЛЭП напряжением до 10 кВт (пл. 0,1091 га), подземные кабельные ЛЭП напряжением свыше 10 кВт (пл. 0,0157 га), ливневая канализация (пл. 0,3578 га), а также охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,2504 га), канализации (пл. 0,2393 га), теплоснабжения (пл. 0,0966 га) и газоснабжения (пл. 0,1753 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **423 600,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **42 360,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **12.03.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.03.2024** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.
Тел. для осмотра: (8017) 658-92-40, 8 (029) 660-07-55.

УНН 690019777

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
8 ЛЮТАГА 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15971)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

DANAYA:

«НЕ ЎЯЎЛЯЮ ЖЫЦЦЯ БЕЗ МУЗЫКІ»

Маладыя імёны

Яе рэдкае, запамінальнае імя мае міфалагічны кантэкст, а творчае амплуа чаруе загадкавасцю і здзіўляе неардынарнасцю. Харызматычная, таленавітая артыстка параўнальна нядаўна на беларускай сцэне, а ўжо паспела заняць уласную нішу і знайсці свайго слухача. Нягледзячы на жорсткі творчы графік, яна сур'ёзна вывучае юрыспрудэнцыю на факультэце права, а яшчэ выкладае, што прымушае заставацца ў тонусе. Таксама творца актыўна прымае ўдзел у дабрачынных канцэртах і з'яўляецца валанцёрам руху БРСМ «Добрае сэрца». Свае песні яна лічыць жыццёвымі, а памылкі называе крокамі да поспеху. Абажае «Кармен» і да гэтай пары не можа забыць свой дэбют на вялікай сцэне. Пра гэта і многае іншае пагаварылі ў эксклюзіўным інтэрв'ю з госцяй «Чырвонкі. Чырвонай змены» — членам Беларускага саюза музычных дзеячаў спявачкай DANAYA (Данаяй Шаршавіцкай).

— Давай пачнём з тваіх каранёў. Адкуль ты родам?

— Я з Барысава. У гэтым горадзе пражыла адзінаццаць гадоў, яшчэ адзінаццаць — у Мінску. Бываю на малой радзіме не вельмі часта. Там у нас застаўся дом, таму ў асноўным ездзім летам.

— У цябе рэдкае і прыгожае імя. Гэта псеўданім?

— Даная — гэта маё імя па пашпарце, а не псеўданім. Для сцэны я пішу яго англійскімі літарамі без прозвішча.

— Раскажы пра сваё дзяцінства. Што асабліва запомнілася?

— Дзяцінства было вельмі актыўным. Я ў тэатры іграла, наведвала мадэльную школу ў Мінску, пасля пачала займацца вакалам. Школа была з музычным ухілам — гэта сальфеджыа, фартэпіяна, вакал, хор, таму дзяцінства было максімальна насычаным. Нядзіўна, што прыйшла да музыкі. Заўсёды хацела іграць на фартэпіяна, хоць мне прапаноўвалі іншыя інструменты... Потым маці пазнаёмілася з кампазітарам Ганнай Казловай. І ўжо ў дзевяць гадоў я прыйшла на эстрадны вакал. Затым была гімназія-школа мастацтваў імя Ахрэмчыка. Выпусцілася з чырвоным дыпломам па спецыяльнасці «Дырыжыраванне. Акадэмічны хор». Цяпер вучуся ў іншай сферы — на юрыдычным факультэце эканамічнага ўніверсітэта.

— Даная, хто стаў тваім аўтарытэтам у творчасці?

— Не ведаю. Шмат каго люблю слухаць. Розную музыку. І класіку абажаю. Напрыклад, на оперу Жоржа Бізэ «Кармен», мне здаецца, магу хадзіць пастаянна. І сучасную музыку люблю. Што датычыцца куміра, то я ніколі на аднаго пэўнага артыста не раўнялася. Ад усіх пакрысе нешта ўзяла — так і склаўся мой вобраз.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

З нагоды

ПАШТОЎКА З НЕЗВЫЧАЙНЫМ ЗМЕСТАМ

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Калі вы апошні раз адпраўлялі паштоўку сваякам, блізкім сябрам ці калегам? Здаецца, са з'яўленнем месенджараў і сацсетак гэта ўсё пачало забывацца... Нягледзячы на развіццё тэхналогій, актывісты БРСМ да адзінага дня галасавання стварылі інфармацыйна-асветніцкі праект «Паштоўка.БЕЛ».

Гэта выглядае як класічная паштоўка з запрашэннем паўдзельнічаць у выбарах і кішэнным календаром, на якім вылучаны важныя дзяржаўныя даты. Удзел у праекце абсалютна бясплатны. Галоўнае — паспець адправіць паштоўку да 20 лютага. Літаральна 2-3 дні — і яна будзе ў руках атрымальніка ў любым кутку Беларусі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Важнае побач

ЗАЎВАЖЫЦЬ НЯБАЧНЫХ ГЕРОЯЎ

Якія думкі прыходзяць вам на розум, калі чуеце словазлучэнне «нябачныя героі»? Як быццам гэта нешта чароўнае, амаль эфемернае, штосьці на мяжы розных светаў. У нашым выпадку так называецца фотавыстава, прысвечаная выхаванцам «Беларускага дзіцячага хоспіса», дзе яны прадстаўлены ў вобразах беларускіх міфічных персанажаў і герояў беларускіх казак. Толькі яна пра наш рэальны свет і пра тое, што кожны ў ім заслугоўвае ўвагі.

Экспазіцыя размясцілася ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Усяго ў ёй прадстаўлена дзевяць герояў, якія на час здымак атрымалі ўнікальную магчымасць пераўвасобіцца ў персанажаў беларускага фальклору. У іх гэта атрымалася настолькі таленавіта і гарманічна, што каля кожнай фатаграфіі хочацца затрымацца. Вось цудоўная Кацярына Ляшко ў вобразе Азярніцы адначасова пяшчотная і магутная ў асяроддзі воднай стыхіі. Ёўніка — сімвал працавітасці і парадку — увасобіў Раман Кукрэш. А побач і маленькі Зюзя, якім на час здымкі стаў Максім Бойчанка. Увесь яго вобраз пра свята, дабрыню і шчырасць. Крыху далей персанаж з зусім іншым настроем — таямнічы капялюшнік — у выкананні Максіма Бекуса. А каб ніхто нічога не пераблытаў, каля кожнай серыі ёсць невялікае апісанне міфалагічнага персанажа.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

8 02 2024 г.

ПАШТОЎКА З НЕЗВЫЧАЙНЫМ ЗМЕСТАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— У перспектыве каля сямідзесяці тысяч такіх паштовак на першым этапе паступіць у рэгіёны. Іх можна атрымаць на мерапрыемствах БРСМ, а таксама на кансалідаваных пікетах, якія цяпер праходзяць па ўсёй краіне, — распавёў **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

Цэнтральнай падзеяй старту праекта стала цырымонія ўрачыстага гашэння на спецыяльных паштовых планшэтах паштовай карткі «Выбіраем будучыню разам!» на Галоўпаштамце. У ёй прынялі ўдзел старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка, міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў, міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган, а таксама першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў.

Паводле слоў Ігара Карпенкі, ЦВК падтрымлівае гэты маладзёжны праект, які ў крэатыўнай форме садзейнічае выбарчым камісіям. Акрамя таго, ён перакананы, што старэйшае пакаленне да гэтага часу памятае, як адпраўлялі адзін аднаму лісты і паштоўкі па пошце:

— Цяпер, з развіццём інтэрнэту і інфармацыйных тэхналогій, гэта стала не так актуальна, але, думаю, атрымаць персанальную маляўнічую паштоўку будзе прыемна. І гэты цікавы праект нагадае выбаршчыкам пра грамадзянскі абавязак кожнага беларуса.

У пазітыўным ключы наконт праекта «Паштоўка. БЕЛ» выказаўся і **міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ:**

— Ідэя добрая: большасць моладзі наўрад ці карысталіся паштоўкамі ў якасці сродку сувязі. А тут выбрана цікавая форма — нарыхтоўка паштоўкі-напаміну аб тым, што 25 лютага пройдзе адзіны дзень галасавання. І маладым людзям, асабліва тым, у каго гэта першы ўдзел у выбарах, будзе ганарова атрымаць такую паштоўку, прыйсці прагаласаваць, пакінуць яе як памяць і паказваць потым сваім сябрам. Ганарова яшчэ і тым, што гэта першы ў гісторыі Беларусі адзіны дзень галасавання, калі мы будзем выбіраць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў.

Міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі Канстанцін ШУЛЬГАН перакананы, што паштоўкі актуальныя ў любы час, і што ўсё новае — добра забытае старое:

— Паштоўкі не толькі маюць калекцыйную каштоўнасць, але і выкарыстоўваюцца як спосаб паведамлення аб нейкіх падзеях сябрам і сваякам. Таму атрымаць папяровае запрашэнне на адзіны дзень галасавання — асабліва цікава.

Пасля цырымоніі ўрачыстага гашэння ўсе ўдзельнікі мерапрыемства адправіліся ў Круглую залу Галоўпаштамта, дзе можна было запоўніць імянную паштоўку і адправіць яе патэнцыяльным выбаршчыкам. Моладзь выстройвалася ў чаргу, запаўняла паштоўкі-запрашэнні і рабіла з імі фота на памяць.

Дарэчы, пра сучасныя тэхналогіі ў БРСМ таксама не забылі. Тут ужо прадставілі новы стыкерпак, прысвечаны электаральнай кампаніі. Гэта 10 яркіх тэматычных стыкераў, якія ў анлайн-рэжыме будуць нагадваць моладзі пра важны этап у жыцці нашай краіны.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Адзіны дзень галасавання

У ФАРМАЦЕ ДЭБАТАЎ

Паспрабаваць свае сілы ў выкарыстанні прыёмаў доказаў ці абвяржэння, прызываючы на дапамогу сродкі палемікі... Незвычайнае па фармаце мерапрыемства для моладзі арганізавалі ў Гомельскім раёне. Маладыя людзі выступілі ў ролі спікераў дэбатаў і паспаборнічалі ва ўменні адстойваць сваю грамадзянскую пазіцыю.

Дэбаты «Моладзь і выбары: формула адказнасці» ў Гомельскім раёне арганізавалі ў рамках дыскусійнай платформы «Беларусь будучыні» Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Беларусі. Вялі мерапрыемства старшыня Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюза Ларыса Леглік і старшыня камісіі па рэгіянальнай палітыцы і ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Беларусі Станіслаў Сямёнаў. Ход дэбатаў ацэньвалі запрошаныя эксперты — старшыні Гомельскага і Добрушскага раённых Саветаў дэпутатаў Вікторыя Ладуцька і Уладзімір Маліноўскі, дэпутат Гомельскага абласнога і раённага Саветаў дэпутатаў, дырэктар Гомельскага доследнага лясгаса Ігар Дзягцярык, начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага райвыканкама Кацярына Лоская і дырэктар Гомельскай абласной арганізацыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Лілія Шахлянкова.

Назіраць за ходам дэбатаў і задаваць хвалюючыя пытанні спікерам маглі і госці сустрэчы — жыхары сельвыканкамаў, моладзь ад працоўных калектываў, прадпрыемстваў і арганізацый Гомельскага раёна.

Для ўдзелу ў дэбатах свае каманды вылучылі маладзёжны Савет Гомельскага раённага Савета дэпутатаў і маладзёжны Савет Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў. Маладым людзям неабходна было справіцца з заданнямі трох тураў. Яны адпаведна вызначаліся пытаннямі, вынесенымі для абмеркавання: «Удзел у выбарах — права кожнага грамадзяніна. Удзел у выбарах — не права, а абавязак кожнага грамадзяніна». «Кожны чалавек мае магчымасць паўплываць на сітуацыю ў краіне». Кожны чалавек не мае магчымасці паўплываць на сітуацыю ў краіне». «Кожны дэпутат павінен несці персанальную адказнасць перад сваімі выбаршчыкамі. Кожны дэпутат не павінен несці персанальную адказнасць перад сваімі выбаршчыкамі».

У кожным туры ўдзельнікам трэба было або абараніць, або абвергнуць сцвярджэнне. Шляхам жараб'ёўкі паміж камандамі вызначалася, які бок яны прымуць: за ці супраць. На падрыхтоўку выступлення маладым людзям давалася пяць хвілін, а пасля кожны ўдзельнік каманды павінен быў абараніць сваю пазіцыю. Пры падрыхтоўцы выступлення можна было карыстацца даведнікамі, абапірацца на цытаты з Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса. Разам з аргументамі ўдзельнікі дэбатаў маглі прыводзіць прыклады са свайго жыцця, вядомыя статыстычныя даныя. Эксперты і госці ў зале пасля выступлення мелі магчымасць задаць пытанне наконт пазіцыі, якую абараняў той ці іншы прамоўца.

Па выніках дэбатаў перамогу атрымала каманда «Маладыя выбаршчыкі» маладзёжнага савета Гомельскага раённага Савета дэпутатаў. Пераможцамі ў намінацыі «Найлепшая аргументацыя» сталі прадстаўнік гэтай жа каманды, памочнік пракурора Гомельскага раёна Аляксандр Асадчы і прадстаўніца каманды «Прафсаюзы — за» намеснік дырэктара Чонкаўскай базавай школы Гомельскага раёна Таццяна Цурко. У намінацыі «Самае яркае выступленне» найлепшым прызнаны актывіст каманды маладзёжнага Савета Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў загадчык філіяла «Урыцкі дом культуры» Юрый Лянкоў. Спецыяльныя прызы ў намінацыі «За волю да перамогі» атрымалі маладыя педагогі Гомельскага раёна — настаўніца Даўгалескай сярэдняй школы Алена Заяц і настаўніца Чонкаўскай базавай школы Юлія Ціткова.

— Напярэдадні Адзінага дня галасавання ўзнятыя моладдзю пытанні вельмі актуальныя. Дэбаты дазволілі не толькі ўдзельнікам каманд, але і гасцям сустрэчы больш глыбока зразумець тэму, прааналізаваць яе і вырашыць, у якім напрамку рухацца далей. Сустрэча аказалася вельмі цікавай і плённай. Наша моладзь чарговы раз даказала, што ёй неабыякавы лёс краіны, — падзялілася ўражаннямі ад мерапрыемства **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА.**

Як звярнуў увагу **старшыня камісіі па рэгіянальнай палітыцы і ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Беларусі Станіслаў СЯМЁНАЎ,** унікальнасць дыялогу, які прайшоў у фармаце дэбатаў, у тым, што ў ім бралі ўдзел каманды маладзёжных Саветаў Гомельскага раённага Савета дэпутатаў і Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў, а таксама эксперты — прадстаўнікі органаў улады.

— Гэта трохбаковы погляд на адно пытанне. Атрымалася цікава і пазнавальна, — падкрэсліў Станіслаў Сямёнаў. — Важна, што ўдзельнікі выказвалі розныя меркаванні аб тым, якім яны бачаць будучага дэпутата, чаго моладзь чакае ад яго. Узнімаліся пытанні магчымасці анлайн-сустрэч з дэпутатамі. Вельмі шмат гаварылі і аб тым, каб дэпутаты былі актыўнымі карыстальнікамі сацыяльных сетак, вялі свае асабістыя старонкі, тым самым станавіліся бліжэй да моладзі і былі з ёй «на адной хвалі».

На тое, што важнасць выбараў сёння нельга недаацэньваць, звярнула ўвагу моладзі і **старшыня Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса ЛЕГЛІК:**

— Апошнім часам некаторыя краіны сутыкаюцца з праблемай, калі больш чым палова насельніцтва не бярэ ўдзел у выбарах. Нельга проста ігнараваць тое, што людзі зусім адмаўляюцца ад выканання свайго грамадзянскага абавязку. Важна, каб наша моладзь не забывала, што і ад яе актыўнай пазіцыі, удзелу ў галасаванні залежыць, якой будзе краіна найбліжэйшыя пяць гадоў.

Самыя актыўныя ўдзельнікі дэбатаў атрымалі памятныя прызы, галоўны з якіх — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Памятныя падарункі атрымалі госці сустрэчы — навучэнцы каледжаў і ліцэяў, члены галіновага прафсаюза АПК, якія будуць упершыню ўдзельнічаць у выбарах.

Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.

Новыя старты

НАМІНАЦЫІ ДЛЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Беларуская чыгунка праводзіць конкурс маладзёжных ініцыятыў сярод работнікаў. Свае творчыя праекты можна прадставіць ва Упраўленне БЧ не пазней за 1 сакавіка ў васьмі намінацыях.

Як інфармуе прэс-цэнтр магістралі, гэта могуць быць маладзёжныя ініцыятывы, накіраваныя на павышэнне бяспекі руху цягнікоў; паляпшэнне ўмоў перавозкі грузаў і пасажыраў; павышэнне прадукцыйнасці працы і рацыянальнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў; эканомію паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў; забеспячэнне аховы навакольнага асяроддзя; паляпшэнне ўмоў і аховы працы на вытворчасці; аўтаматызацыю і механізацыю вытворчых працэсаў; лічбавую трансфармацыю вытворчых працэсаў.

Маладзёжная ініцыятыва павінна змяшчаць электронную візітоўку і кароткае апісанне (мэты і задачы ініцыятывы, аналіз закранутай праблемы, вынікі даследаванняў і (або) апісанне практычных распрацовак, рэалізацыя задумы, а таксама адпаведныя дадаткі — фота- і відэаматэрыялы, графікі, табліцы, мультымедыйныя прэзентацыі і інш. — аформленыя ў адвольнай форме). Творчы праект неабходна зарэгістраваць у раздзеле «Маладзёжныя ініцыятывы» АС «Рацыяналізатар».

У конкурсе могуць узяць удзел прадстаўнікі працоўнай моладзі арганізацый і адасобленых структурных падраздзяленняў Беларускай чыгункі ва ўзросце да 31 года, а таксама навукова-вытворчыя маладзёжныя калектывы.

Праекты, якія зойміуць прызавыя месцы, будуць дэталёва вывучаны профільнымі спецыялістамі для іх магчымага ўкаранення на магістралі.

Конкурс маладзёжных ініцыятыў праводзіцца на Беларускай чыгунцы з 2017 года. За гэты час больш чым 140 працаўнікоў магістралі сталі яго пераможцамі. Звыш 50 працэнтаў іх творчых праектаў былі рэалізаваны.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ЗАЎВАЖЫЦЬ НЯБАЧНЫХ ГЕРОЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Па словах дырэктара грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хоспіс» Ганны Гарчаковай, ідэя гэтай выставы — паказаць асобу кожнага дзіцяці:

— Часам мы такіх дзяцей не разумеем і кажам, што яны некантактныя, але насамрэч у іх проста іншая мова і сваё ўспрыманне свету. Выставы, накшталт нашай заклікаюць да таго, каб людзі навучыліся бачыць у тых, хто побач і хварэе, такіх жа асоб, як яны самі, і замест жалю праявілі эмпатыю, — адзначае яна.

А што наконт назвы выставачнага праекта? Чаму менавіта «Нябачныя героі»?

— Вельмі часта інваліды ідуць па жыцці паралельна са здаровымі людзьмі. Мне гэта не надта прыемна, бо ўсе імкнуцца заплюшчваць на іх вочы. Менавіта таму наша выстава называецца «Нябачныя героі», — тлумачыць кіраўнік аддзела фандрайзінгу грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хоспіс» Юлія Камагорцава. — Як і міфічныя персанажы, людзі з інваліднасцю знаходзяцца побач са звычайнымі людзьмі, але камунікуюць з імі, толькі калі ў тым ёсць патрэба або жаданне ў нейкага боку. Мы вырашылі, што ў гэтым ёсць пэўная паралель.

Наогул, кожная з 45 фатаграфій на выставе цудоўная і ўнікальная. Партрэты падапечных таленавіта раскрыты праз прызму чараўніцтва, міфалогіі, гульні са святлом. Аўтар здымкаў — студэнтка Мінскага дзяржаўнага каледжа сэрвісу і тэхналогій Ксенія Ляговіч. Менавіта дзякуючы ёй і супрацоўніцы хоспіса Ульяне Казакевіч з'явіўся такі праект. Атрымалася неверагоднае спалучэнне любові да беларускай міфалогіі і падапечных хоспіса. Здымкі для мадэляў ператварыліся ў сапраўдную прыгоду, бо яны адбываліся на самых розных лакацыях: у музеях, школах мастацтваў і нават у студыі падводнай здымкі.

Па словах фатографа, працавалі ў вельмі камфортнай, добразычлівай атмасферы. Падапечным хоспіса і іх бацькам гэтая творчая актыўнасць была ў радасць. Але дзяўчына прызнаецца, што без каманднай работы і без дапамогі Ульяны Казакевіч, якая ўжо даўно ўзаемадзейнічае з такімі дзецьмі, прыйшлося б складана.

— Насамрэч, дзякуючы здымкам, я сама паглядзела на людзей з асаблівасцямі зусім іншымі вачыма. Для мяне гэта вялізны вопыт. Я рада, што мы з імі знайшлі кантакт і ўсё прайшло цудоўна, — распавядае Ксенія Ляговіч.

Больш за ўсё фатографу запомнілася здымка з Макарам Рудніцкім, які паўстаў перад гледачамі ў вобразе дракона — героя народных казак і сімвала 2024 года. Хутчэй маленькага мілага дракончыка. Вобраз для хлопчыка падабрала Ульяна Казакевіч, а далей агульнымі сіламі збіралі чароўны гарнітур смарагдавага колеру.

— Гэта была вельмі цёплая здымка, — успамінае Ксенія Ляговіч. — Хлопчык проста выдатны. Але складанасць была ў тым, што, калі фатаграфуеш маленькае дзіця, яно, вядома ж, хоча бегаць і гуляць. Вельмі выратавалі яго маці і Ульяна. Яны ўвесь час адцягвалі ўвагу малога, а я хутка рабіла кадры. Памятаю, яму вельмі спадабалася лямпа асвятлення, бо яна была падобная на Месяц.

Адным словам, фотапраект, які спалучае ў сабе важную ідэю, эмпатыю, народную культуру і мастацтва, атрымаўся на славу. Да таго ж ён зрабіў тое, што, здавалася б, падуладна толькі чараўнікам: ператварыў нябачных герояў у бачных і паказаў усім, што цуды здараюцца.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Мелодыя натхнення

ЧАЛАВЕК-АРКЕСТР,

або Мастацтва вакальнай перкусіі

Біты, рытмы і мелодыя... Але ўсё гэта — толькі пры дапамозе голасу чалавека. Менавіта гэты інструмент з'яўляецца асноўным складнікам бітбокса. Мы паразмаўлялі з трыццацігадовым Ільёй Данільчыкам, бітбоксерам з Баранавіч, і даведаліся падрабязнасці работы ў гэтым музычным жанры.

Бітбокс уключае ў сябе спосабы стварэння кампазіцыі пры дапамозе рота, вуснаў, горла, голасу і часам рук. Ён таксама можа ўключаць спяванне, вакальны скрэтч, імітацыю работы з круцёлкамі, гукам духавых інструментаў, струн, дыджэй-скрэтчаў... Раней бітбокс быў цесна звязаны з хіп-хоп-культурай, часта згадваўся як «пяты элемент хіп-хопа», аднак пазней абмежаванні ў стылях перасталі мець значэнне. Тэрмін «бітбокс» часам выкарыстоўваецца для абазначэння вакальнай перкусіі ўвогуле.

— З самага дзяцінства мяне цягнула ў музычнае асяроддзе. Аднак жыццё павярнулася так, што я маю сярэднюю спецыяльную адукацыю электраслесара па рамонце электрычных машын. І гэта, вядома, не тое, што прыносіць задавальненне майму сэрцу. Прыкладна ў 2007 годзе дзякуючы даступнасці інтэрнэту я адкрыў для сябе такі кірунак, як бітбокс. Менавіта там упершыню ўбачыў, як хлопец сваім голасам робіць дзіўныя рэчы. Без музычных інструментаў ён ствараў музыку! Гэта ўзарвала мозг і бударажыць маё сэрца да сёння. Наогул, я лічу, што бітбокс пры правільным яго выкананні і падачы ператвараецца з навыку ў сапраўднае мастацтва.

Першае сваё выступленне наш герой прыгадвае з асаблівым трапятаннем і цеплынёй. Гэта быў 2009 ці 2010 год, Ілья ў якасці бітбоксера выступіў у роднай баранавіцкай школе № 14, чым выклікаў сапраўдны фурор.

— Сказаць, што аднакласнікі і настаўнікі былі ў шоку — нічога не сказаць. Я купаўся ў промнях школьнай славы яшчэ некалькі дзён пасля выступлення. Потым з'явілася магчымасць паказаць свае здольнасці на вяселлі праз знаёмага вядучага. І я яшчэ раз пераканаўся ў тым, што хачу здзіўляць людзей і развівацца ў гэтым кірунку. Дзякуючы такім маленькім крокам стаў дастаткова вядомым бітбоксерам, якога запрашаюць на мноства мерапрыемстваў. Дарэчы, бацькі заўсёды падтрымлівалі мае ідэі, і тут тата дапамагае мне з увасабленнем ідэй.

Наш герой выступае на розных мерапрыемствах, як прыватных, так і дзяржаўных. Найбольш вядомымі з'яўляюцца «Брэнд года», «Тэлевяршыня», рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства «ProfSkills Belarus». Як заўважае суразмоўнік, за сямнаццаць гадоў усіх выступленняў ужо і не прыгадаеш. Акрамя таго, за плячыма ў яго не адзін прафесійны конкурс, у многіх ён займаў першыя месцы. З часам перастаў удзельнічаць у творчых спаборніцтвах. Цяпер вельмі часта выступае ў якасці запрошанага госця.

— Бітбоксінгу можа навучыцца практычна кожны і ў любым узросце. Але пры наяўнасці некаторых здольнасцяў авалодаць такім відам музычнага мастацтва будзе нашмат прасцей. А гэта пачуццё рытму, музычны слых і асновы вакальнага мастацтва. Таксама кожны бітбоксер мае свой непаўторны стыль. Ёсць адзін хлопец, падачу і ў цэлым выступленні якога я бяру як арыенцір для паспяховага прасоўвання свайго асабістага бітбокс-брэнда. Яго завуць Ілья Арэхаў. Цяпер я маю ўласнае бітбокс-шоу пад назвай «Магія голасу», дзе стараю з нуля папулярныя трэкі пры дапамозе лупстанцыі. Гэта такі невялікі сэмплер, які накладваю гукі адзін на другі і непасрэдна голас самога бітбоксера. Яшчэ я прыдумаў некалькі цікавых імправізацый, у якіх раблю трэкі з галасоў гледачоў падчас сваіх выступленняў.

Ілья адзначае, што бітбокс дагэтуль з'яўляецца нечым дзіўным і цікавым, нестандартным і крэатыўным. Аднак у нашай краіне ён не асабліва папулярны і як кам'юніці ўжо разваліўся ў 2014—2015 гадах. Вядома, ёсць хлопцы, якія выступаюць на сцэне з бітбоксам, але іх вельмі мала.

— Я пажадаў бы пачаткоўцам-бітбоксерам у першую чаргу ісці да канца, не закідваць гэтую справу, бо вы пакуль яшчэ эксклюзіў. Апроч самой тэхнікі, займайцеся вакалам, спрабуйце некалькі музычных інструментаў. Эксперыментуйце, стварайце і не звважайце на насмешкі сяброў, аднакласнікаў, і тады ваша бітбокс-дрэва прынясе плён.

Ангеліна НОВІКАВА.
Фота дадзена героем.

Стракаты свет

НА ШКОЛЬНУЮ ФОРМУ ЎВЯДУЦЬ ДЗЯРЖСТАНДАРТ

Ён будзе зацверджаны ў 2024 годзе і набудзе сілу з сярэдзіны 2025 года, паведаміў кіраўнік «Расійскай сістэмы якасці» Максім Пратасаў.

Чыноўнік падкрэсліў, што дзяржстандарт не будзе вызначаць асартымент, від, колер або дызайн адзення для школы. У ім будуць выключна патрабаванні, якія датычацца бяспекі і спажывецкіх уласцівасцяў прадукцыі.

«Нам трэба, каб форма была гіграскапічная, паветрапранікальная, зносаўстойлівая, а тканіны не былі б пафарбаваны таксічнай фарбай. А якога яна будзе колеру, фасону, памеру — гэта вырашыць школа і бацькоўскі камітэт», — сказаў ён.

Паводле слоў Максіма Пратасава, даследаванне «Расійскай сістэмы якасці» паказала, што цяпер большая частка тавару пад назвай «школьная форма» — насамрэч хутчэй «касмічны скафандр»: яна не дыхае і не прапускае вільгаць.

У ВНУ БУДУЦЬ РЫХТАВАЦЬ... МЕДЫЯПАЛІЦЭЙСКІХ

Расійская акадэмія народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы (РАНГіДС) запусціла праграму бакалаўрыяту «Медыязабеспячэнне дзяржаўных інтарэсаў і нацыянальнай бяспекі». Яна будзе доўжыцца чатыры гады.

Гэта першая ВНУ, у якой будуць рыхтаваць медыяпаліцэйскіх. Яны зоймуцца правапарушэннямі ў адносінах да грамадзян (кібербулінг), юрыдычных асоб (пірацтва) і дзяржавы (экстрэмізм). Заадно стануць маніторыць сетку на прадмет абразы пачуццяў вернікаў.

Загадчыца кафедры медыязабеспячэння дзяржаўных інтарэсаў і нацыянальнай бяспекі РАНГіДС Лідзія Малыгіна заявіла: «У задачы «медыяправаахоўнікаў» уваходзіць барацьба з прапагандай тэрарызму, ідэалогіі крымінальнай культуры, суіцыдаў сярод падлеткаў, абразы пачуццяў веры. Гэта пытанне нацыянальнай бяспекі. Менавіта таму праграма рэалізуецца пры падтрымцы Нацыянальнага антытэрарыстычнага камітэта».

ЛОЖКА-МЕСЦА — ТОЛЬКІ ПА ЭЛЕКТРОННЫХ ЗАЯВАХ

Ва Узбекістане месцы ў студэнцкіх інтэрнатах з 2024/2025 навучальнага года будуць выдзяляць толькі на аснове электроннай заявы праз Цэнтры дзяржаўных паслуг і Адзіны партал інтэрактыўных дзяржаўных паслуг. У бягучым навучальным годзе гэты парадак дзейнічае для студэнтаў першых курсаў, астатніх размяшчаюць традыцыйным спосабам.

Раней Кабінет міністраў сваёй пастановай зацвердзіў Адміністрацыйны рэгламент аказання дзяржаўных паслуг па размяшчэнні студэнтаў дзяржаўных ВНУ ў інтэрнатах, паведаміла прэс-служба Міністэрства юстыцыі.

Згодна з дакументам, размяшчэнне ў студэнцкім інтэрнаце будзе весціся толькі шляхам падачы электроннай заявы ў Цэнтры дзяржаўных паслуг і на Адзіны партал інтэрактыўных дзяржаўных паслуг. Гэта дазволіць студэнтам адсочваць чаргу анлайн і праводзіць плацяжы.

Дагаворы арэнды жылога памяшкання, якія заключаюцца са студэнтамі, будуць афармляцца анлайн праз асабісты кабінет падаткаплацельшчыка ў органах дзяржаўнай падатковай службы з дапамогай метаду аддаленай біяметрычнай ідэнтыфікацыі.

У 2022 годзе каля 41 працэнта студэнтаў былі забяспечаны месцамі ў інтэрнатах. У 2020 годзе гэтая лічба складала 28 працэнтаў, колькасць месцаў павялічылі дзякуючы двух'ярусным ложкам, аптымізацыі размяшчэння і ўводу ў эксплуатацыю новых інтэрнатаў. Аднак у пачатку 2022/2023 навучальнага года мноства студэнтаў, тым не менш, сутыкнуліся з недахопам месцаў для засялення. Тады нават адкрылі часовыя інтэрнаты ў гандлёва-вытворчым комплексе.

НА ЎРОКАХ ЗА АДНОЙ ПАРТАЙ РАЗАМ З... САБАКАМ

Вучань пачатковай школы ў Перу звярнуўся да сваёй настаўніцы з незвычайнай просьбай. З-за жыццёвых цяжкасцяў дома не было нікога, хто б мог прыгледзець за яго сабакам Пекенья, пакуль хлопчык знаходзіўся ў школе. Аб гэтай гісторыі паведаміла выданне «Афіша Daily». Думка аб тым, што сабака адзін, прымушала хлопчыка адчуваць сум.

«Ён спытаў мяне, крыху нервуючыся, ці можа Пекенья пайсці з ім у школу», — сказала настаўніца хлопчыка. Яна пагадзілася і дазволіла вучню браць з сабой сабаку. «Я ведаю, як шмат ты спрабуеш вучыцца, я ведаю, што ў цябе ёсць цяжкасці, я ведаю, праз які боль ты праходзіш па прычыне, якая вядомая толькі нам з табой», — падпісала настаўніца ролік у TikTok, дзе хлопчык трымае сабаку на каленях падчас урокаў.

Па словах педагога, цяпер хлопчык прыходзіць са сваім сабакам на кожны ўрок. Пекенья дапамагае не толькі свайму гаспадару, але і іншым вучням. «Сабака стаў для нас членам сям'і», — напісала настаўніца.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«НЕ ЎЯЎЛЯЮ ЖЫЦЦЯ БЕЗ МУЗЫКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Ці памятаеш свой дэбют на сцэне?

— Свой дэбют на эстрадзе памятаю. У чатыры гады іграла ў тэатры не вельмі паслухмяную дзяўчынку. У гэтым спектаклі са мной ігралі і мае бацькі. Прычым абсалютна выпадкова (*усміхаецца*). Тады захварэлі галоўныя героі — іх вырашылі замяніць маімі бацькамі. Для маці гэта было больш-менш нармальна, таму што яна ў свой час вучылася ў музычнай школе. А для бацькі, як для ўрача, гэта было нешта вельмі незвычайнае, незразумелае, але ён справіўся (*смяецца*).

— Задумвалася, хто твой слухач?

— Слухач мой, напэўна, вельмі добры, шчыры, які разумее і прымае.

— Раскажы пра сваю музыку. Як можаш яе апісаць? І па якіх кампазіцыях можна цябе пазнаць?

— Песні ўвогуле дастаткова жыццёвыя, акрамя дзвюх апошніх — «Дафамін» і якая не так даўно выйшла — «Не давяраць». У некаторых сінглах нават ёсць цытаты, запісаныя і з маіх слоў. А пазнаць мяне можна па песнях «Дафамін», «GPS», «Крэмавае неба» і кампазіцыі «Не давяраць», якая, спадзяюся, заляціць у чарты і сэрцы слухачоў.

— Ці сутыкалася хоць раз з творчым выгараннем?

— Выгаранне было адзін раз на трэцім курсе каледжа. Я адпусціла на той момант нейкія сітуацыі, вырашыла: што будзе, тое будзе. І яно прайшло. А ўвогуле я займаюся любімай справай, якой гару. Таму выгарання моцнага не лаўлю.

— Даная, ведаю, што, акрамя сцэны, ты яшчэ педагог. Раскажы пра гэта.

— Гэта няпроста. Да ўсяго трэба быць яшчэ і псіхолагам — каб знайсці падыход да кожнага вучня. А ў мяне займаюцца не толькі дзеці, але і дарослыя. Не магу сказаць, з кім лягчэй і прасцей: ва ўсіх ёсць свае нюансы, моманты, пытанні.

— Што параіш пачаткоўцу, які марыць аб прафесійнай сцэне?

— Не здавацца і не губляцца, калі ў цябе што-небудзь не атрымліваецца. Літаральна ўчора гаварыла аб гэтым сваёй выхаванцы. На ўроку яна выканала пэўныя ноты не так, як можа і як мне хацелася б. (Трэба сказаць, што на занятках ніколі не сваруся.) Задала пытанне: «Чаму ты так зрабіла?» Вучаніца не ведала адказу, але адчула праз мае словы, што праспявала няправільна. Малая расплакалася, і я палову ўрока тлумачыла,

што памылкі — гэта крокі да поспеху.

— Ці шмат сяброў з'явілася дзякуючы музыцы?

— Не магу сказаць, што ў мяне шмат сяброў, якія з'явіліся дзякуючы музыцы. Хутчэй, гэта проста знаёмыя, а не сябры, з якімі мы можам сустрэцца на рабоце і пагаварыць.

— Якую апошнюю кнігу ты прачытала?

— Даўно не чытала. З кнігамі ў мяне такая гісторыя: калі пачынаю

чытаць і мяне захоплівае, значыць, гэта мая кніга. І выдаткоўваю свой час для яе. Калі не захоплівае, магу адкласці і пачаць чытаць праз паўгода, пару месяцаў, год. Так адбылося з маёй любімай кнігай «Кансуэла» Жорж Санд. Памятаю, пачала чытаць, потым неяк закінула і цалкам прачытала, не адрываючыся, усе два тамы, напэўна, праз год.

— Чым, акрамя музыкі, яшчэ захапляешся?

— Мне здаецца, я захапляюся толькі музыкай і вучобай на факультэце права. Калі б не музыка... Нават не ведаю, што адказаць. Музыка была заўсёды ў маім жыцці, і я не ўяўляю жыццё без музыкі. Магчыма, гэта быў бы мадэлінг, тэатр, альбо я была б звычайным падлеткам, студэнткай.

— Што станоўчае, а што адмоўнае, на тваю думку, у прафесіі артыста?

— Станоўчае ў прафесіі артыста — гэта шалёны энергаабмен. Нават калі ў цябе няма настрою перад пэўным канцэртам (бывае ўсялякае), то, калі выходзіш на сцэну, адбываецца абмен энергіяй і зараджаешся па максімуме. Адмоўнае — жорсткі графік. Мала спіш, мала ясі...

— Ведаю, што ты актыўна ўдзельнічаеш у дабрачынных акцыях. Напрыклад, сёлета выступала на канцэрце «Усе фарбы жыцця для цябе» ў падтрымку 14-гадовай Ксеніі Вілюхі.

— Так, я прымаю ўдзел у дабрачыннасці. Калі ў мяне ўсё ў парадку з датай гэтага канцэрта, я нікуды не з'ехала, то, вядома, выступлю. З радасцю дапамагу. Калі гэта збор сродкаў на лячэнне дзіцяці, то я куплю які-небудзь падарунак яму ці проста пакладу пэўную суму ў канверт. У гэтым плане я заўсёды адкрытая да прапаноў і стараюся ніколі не адмаўляцца.

— Даная, які галоўны пасыл ты нясеш сваёй творчасцю?

— Не магу вызначыць які-небудзь адзін пасыл. Напэўна, гэта прапаганда кахання, магчыма, пэўнай жаночай сілы.

— Чым парадуеш у хуткім часе прыхільнікаў?

— На новую песню хутка выйдзе відэаработа, не хачу гэта называць кліпам. Ну і, вядома, будуць канцэрты, новыя калабарацыі, трэкі.

— Пажадай што-небудзь чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены».

— Я даю інтэрв'ю крыху хворая. Прастуда моцна адбілася на маім галасавым апараце. Таму хачу пажадаць чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены» бязмежнага здароўя (цяпер гэта ўсім патрэбна). А яшчэ жадаю поспехаў ва ўсіх пачынаннях. Не бойцеся рабіць штосьці новае, займацца чымсьці незвычайным і рызыкаваць. Кахання і бязмежнага шчасця!

— Дзякуй за цікавае інтэрв'ю! Поспехаў, новых яркіх праектаў, здароўя і пазітыву!

Надзея ЗУЕВА.

Фота з уласнага архіва спявачкі.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.896.
Нумар падпісаны ў 19.30 07.02.2024 г.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Станок строгальный четырехсторонний Profimat 23E (WEINIG), инв. № 44502024	25680,00	2568,00	1284,00
2	Стреппинг-машина TP-6000-1, инв. № 4016004	4176,00	417,60	208,80
3	Автопогрузчик НС CPCD35N-RW13 (стал. каб. с отоп., каретка, мачта V3000), инв. № 50426365; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625027) к инв. 50426365, инв. № 45625027	25830,00	2583,00	1291,50
4	Форвардер Valtra 6750, гос. номер АК1 8801, инв. № 50080; полуприцеп лесовозный Palms 13D, 2020 г. в., сер. № 21819, гос. ном. АМ-1 4496, инв. № 50414006	66960,00	6696,00	3348,00
5	Щетка дорожная «БелДТ-5002 Ф2», инв. № 50426447	7860,00	786,00	393,00
6	Платформа транспортная 2ПТТ-918, инв. № 41008	2460,00	246,00	123,00
7	Полуприцеп тракторный самосвальный ПТПЩ28, инв. № 50413004	27480,00	2748,00	1374,00
8	Станок для разделки углов в бревнах (инв. № 60100), рольганг (18 м) (инв. № 50426372)	25800,00	2580,00	1290,00
9	Форвардер Valtra 6750 гос. номер ОК-5 2581 (инв. № 50073) с гидроманипулятором Paims 5,72 (A4 HS BR2 серийный № 25486) 2020 г. в. (инв. № 41716004)	83400,00	8340,00	4170,00
10	Привод УМ, Т-80 к трактору, инв. № 70270	1500,00	150,00	75,00
11	Форвардер Valtra 6750 № 72-60 ОА (50081), гос. номер ОМ-5 8399, инв. № 50081	49320,00	4932,00	2466,00
12	Форвардер Valtra 6750, гос. номер ОВ-5 09-20, инв. № 70210	55500,00	5550,00	2775,00
13	Форвардер Valtra 6750, гос. номер 5019 АВ, инв. № 50074	49320,00	4932,00	2466,00
14	Харвестер Valtra-X120 Forester 72-63 ОА, гос. номер ОМ-5 8401, инв. № 50084	72000,00	7200,00	3600,00
15	Харвестер Valtra-X120 Forester, гос. номер АМ-1 2174, инв. № 50082	72000,00	7200,00	3600,00
16	Харвестр Valtra x120 F-лайн (кето 51 + мотомит ИТ) гос. номер ОК-5 0575, инв. № 50426027	72000,00	7200,00	3600,00
17	Автомобиль MAZ-631708-364-000P1 с гидроманипулятором «Майман» ММ100-03, гос. номер АС 0964-5, инв. № 50408001; прицеп МАЗ-892620-010 № Y3M892620J0000448, А 3706 Е-5 к АС 0964-5, инв. № 50414001	106920,00	10692,00	5346,00
18	Прицеп МАЗ-857102-(010), инв. № 50426267	16440,00	1644,00	822,00
19	Автомобиль МАЗ 5440В9, шасси Y3m544B9F0001057, инв. № 50426473; полуприцеп бортовой тентовый KOEGEL SN24P, инв. № 50426501	38100,00	3810,00	1905,00
20	Автомобиль-сортиментовоз АСК-18А КАМАЗ (гос.ном. АС 8538-5), инв. № 50426445; прицеп-сорт-воз А0883Е1 Т8302А VIN127 Ф1, инв. № 50426461	91080,00	9108,00	4554,00
21	Автомобиль-сортиментовоз КАМАЗ АСК-18А, инв. № 50426428; прицеп-сортиментовоз Т8302А VIN126 гос. номер А 7160 Е-5 Ф3, инв. № 50426462	91080,00	9108,00	4554,00
22	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*85*3000 – 3,029 м³ / 1 пакет по 396 шт.	1680,00	168,00	84,00
23	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*85*3700 – 3,736 м³ / 1 пакет по 396 шт.	2100,00	210,00	105,00
24	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*85*3700 – 3,736 м³ / 1 пакет по 396 шт.	2100,00	210,00	105,00
25	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*85*3700 – 3,736 м³ / 1 пакет по 396 шт.	2100,00	210,00	105,00
26	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 - 3,104 м³ / 1 пакет по 363 шт.	1740,00	174,00	87,00
27	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 - 3,104 м³ / 1 пакет по 363 шт.	1740,00	174,00	87,00
28	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 - 3,104 м³ / 1 пакет по 363 шт.	1740,00	174,00	87,00
29	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 - 3,104 м³ / 1 пакет по 363 шт.	1740,00	174,00	87,00
30	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 - 3,104 м³ / 1 пакет по 363 шт.	1740,00	174,00	87,00
31	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м³ / 1 пакет по 363 шт.	1740,00	174,00	87,00
32	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
33	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
34	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
35	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
36	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
37	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
38	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
39	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
40	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
41	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
42	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
43	Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м³/ 1 пакет по 363 шт.	2100,00	210,00	105,00
44	Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %) 12*65*3700 – 2,597 м³/ 1 пакет по 900 шт.	1200,00	120,00	60,00
45	Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %) 12*65*3700 – 2,597 м³/ 1 пакет по 900 шт.	1200,00	120,00	60,00
46	Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12-16 %) 12*65*3700 – 2,597 м³/ 1 пакет по 900 шт.	1200,00	120,00	60,00
47	LVL-брус LVL Ultralam-R: 39*64*13100 – 20,01 м³	24060,00	2406,00	1203,00
48	LVL-брус LVL Ultralam-R: 39*64*13500 – 3,639 м³	4380,00	438,00	219,00
49	LVL-брус LVL Ultralam-R: 39*89*13500 - 4,264 м³	5100,00	510,00	255,00
50	Станок оцилиндровочный «Практик-2» (экспл. 2014), инв. № 50426347	4 512,00	451,20	225,60
51	Радиостанция автомобильная-портативная STABO XH9006E (Герман.) (экспл. 2019), инв. № 45625029	81,60	8,16	4,08
52	Радиостанция автомобильная-портативная STABO XH9006E (Герман.) (экспл. 23.08.2019), инв. № 45625031	81,60	8,16	4,08
53	Автомобиль ЗИЛ-131, 1981 г. в. (экспл. 2012) (17837 км), инв. № 50426064	4 512,00	451,20	225,60
54	Автомобиль-сортиментовоз АСК-18А КАМАЗ, 2014 г. в. (экспл. 2015) (236523 км), инв. № 50426422; прицеп-сортиментовоз Т8302В Х52Т8302ВD0000086, 2013 г. в. (экспл. 2013), инв. № 50426262	55 296,00	5 529,60	2 764,80
55	Автомобиль-сортиментовоз КАМАЗ АСК-18А, 2015 г. в. (экспл. 2015) (314000 км + 8255 км), инв. № 50426427; Прицеп МАЗ-892620-022 № Y3M892620J0000576, 2018 г. (экспл. 2018), инв. № 50414002	56 064,00	5 606,40	2 803,20
56	Прицеп 2ПТС-4.5 (экспл. 2010), инв. № 70274	2 256,00	225,60	112,80
57	Прицеп-сортиментовоз Т8302В Х52Т8302ВD0000087 2013 г. в. (экспл. 2013), инв. № 50426263	5 760,00	576,00	288,00
58	Навигатор-видеорегистратор а/м PRESTIGIO PGPS7059CIS04GBPG (экспл. 2018), инв. № 45632013	23,04	2,30	1,15
59	Автомобиль LADA 21230 000-А4 с дополнит. оборуд., VIN X9L212300M0733086, г. в. 2021 г. (экспл. 2021) (68482 км), инв. № 50418019	21 888,00	2 188,80	1 094,40
60	Автомобиль груз. фургон ЗИЛ-131 АМ 0267-5, 1988 г. в. (экспл. 2012) (61070 км), инв. № 50426151	4 512,00	451,20	225,60
61	МАЗ-631708 комплект 364-000Р1, шасси Y3M631708J0001182 с гидроман. 2010Т гос. номер АС 6636-5, 2018 г. в. (экспл. 2018) (205618 км), инв. № 50402002; прицеп МАЗ-892620-010 № Y3M892620K0000670, гос. № А 5358 Е-5 к АС 6636-5, 2019 г. в. (экспл. 2019), инв. № 50414005	76 416,00	7 641,60	3 820,80
62	Прицеп СЗАП-8527, 1991 г. (экспл. 2000), инв. № 50035	2 256,00	225,60	112,80
63	Станок двухпильный Tiger MS550 (экспл. 2017), инв. № 44502001	4 848,00	484,80	242,40
64	Автомобиль ГАЗ-66 с кунгом (гос. ном. АС 3872-5 с 2018 г.) 1978 г. в. (экспл. 2003) (99000 км), инв. № 50085	3 168,00	316,80	158,40

В отношении лотов №№ 1, 2 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 161 (30041) от 22.08.2023, стр. 6, № 205 (30085) от 21.10.2023, стр. 14, № 232 (300962) от 30.11.2023, стр. 11, № 241 (300971) от 13.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 14, № 12 (300996) от 18.01.2024, стр. 11. В отношении лотов №№ 3–49 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 205 (30085) от 21.10.2023, стр. 14, № 232 (300962) от 30.11.2023, стр. 11, № 241 (300971) от 13.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 14, № 12 (300996) от 18.01.2024, стр. 11.

В отношении лотов №№ 50–64 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 178 (30058) от 14.09.2023, стр. 11, № 206 (30086) от 24.10.2023, стр. 6, № 224 (300954) от 18.11.2023, стр. 15, № 239 (300969) от 09.12.2023, стр. 14, № 252 (300982) от 28.12.2023, стр. 10, № 12 (300996) от 18.01.2024, стр. 11

Местонахождение лотов №№ 1, 2, 9–21, 47–49, 58–64: Минская обл., г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40.
Местонахождение лотов №№ 3–8, 22–46, 50–57: Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3Б

МАЗ-631708 (гос. номер АС 6636-5) имеет обременение в виде залога.
Залог прекращается в случае реализации объекта на торгах (ст. 333 ГК РБ)

Дата и время проведения торгов	**22 февраля 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**С 10.00 8 февраля 2024 года до 16.00 20 февраля 2024 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 22.02.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375292751275, Виноградов Дмитрий Алексеевич (понедельник–пятница с 9.00 по 17.00)** – лоты №№ 1, 2, 9–21, 47–49, 58–64; **+375333031971, Ермошкевич Евгений Васильевич** – лоты №№ 3–8, 22–46, 50–57.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, УНП 191021390
Продавец	ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1. УНП 400068171
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 % бел. руб.
1	**Полуприцеп специальный фургон – рефрижератор KUPAVA 9300W0, рег. знак А3222 А-3**, 2008 г. в., инв. № 4241	**45 358,90**
2	**Автомобиль сортиментовоз MAZ 6303A8, рег. знак АН 3669-3**, 2012 г. в., инв. № 6427 **Прицеп сортиментовоз MAZ 837810-022, рег. знак А 9108 В-3**, 2012 г. в., инв. № 6428	**51 072,00**
3	**Прицеп специальный фургон изотермический MAZ 837810 KUPAVA 871100, рег. знак А 3237 А-3**, 2008 г. в., инв. № 4246	**30 794,35**
4	**Прицеп специальный фургон изотермический MAZ 83810 KUPAVA 871100, рег. знак А 3520 А-3**, 2008 г. в., инв. № 4278	**25 956,30**

Месторасположение **– г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1**

Цена снижена на 15 % по лотам №№ 1, 3, 4 и на 20 % по лоту № 2

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **12 (двенадцати)** рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 6 % для лота № 1, 5 % для лота № 2 и 7 % для лотов №№ 3, 4 от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.09.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 26.02.2024 в 13.00. Окончание торгов: 26.02.2024 в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.02.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» – www.ipmtorgi.by

Контактные данные: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by

ПТУШКІ — ЯК ЛЕКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«А давайце мы завітаем у госці да вашага таты», — прапанавалі мы па тэлефоне клапатлівому сыну. «Вядома, я сам вас з задавальненнем адвязу. Тата, паверце, вельмі ўзрадуецца. Раней ён быў публічнай асобай. Шмат кантактаваў з рознымі людзьмі, ездзіў па свеце, прымаў важныя рашэнні. Сам медык, шмат гадоў загадваў аддзелам аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама, узначальваў Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа, быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Калі 18 гадоў таму выйшаў на пенсію, яго жыццё кардынальна змянілася. Апошнія гады ён наогул прывязаны да дому, спачатку з-за кавіду не выходзіў нікуды, бярогся, бо ў яго цукровы дыябет. Цяпер у мамы сур'ёзныя праблемы з суставамі, яна перасела на інвалідную каляску. Таму тата ў нас, як ён сам жартуе, і кухар, і медсястра, і санітарка, і сядзелка, і доктар, які лечыць. Мы з сястрой, вядома, як можам дапамагаем, праведваем іх пры кожнай магчымасці. Але ўсё адно тату псіхалагічна вельмі цяжка. На шчасце, у яго ёсць аддушына. Штовосень мы разам з ім садзімся ў машыну і едзем на рынак. Там тата купляе тры бульбяныя мяхі семечак і столькі ж проса. Ён зрабіў кармушку перад домам. І да яго злятаюцца розныя птушкі. У асноўным гэта сінічкі і вераб'і. Але часам завітваюць і дзятлы, і папаўзні, і дубаносы, і зялянушкі, і сойкі, і гілі. Прыязджайце, ён вам усё сам з радасцю пакажа і раскажа».

СТАЛОЎКА ДЛЯ СІНІЧАК

Антон Аляксеевіч адмыслова, пакуль чакаў нас, крыху падкарміў птушак. Таму калі мы пад'ехалі, то ўбачылі, як некалькі дзясяткаў вераб'ёў ды сінічак імгненна пырхнулі з кармушкі на суседнія дрэвы.

— Вы блізка не падыходзьце, яны вельмі асцярожныя, ад людзей стараюцца трымацца на адлегласці. Зараз яшчэ крыху корму падсыплю, і будзем назіраць. Гаспадар ідзе на веранду, дзе стаяць два мяхі семечак і два мяхі проса — усё, што засталося з зімовых запасаў. Зачарпнуў у пластыкавы кантэйнер проса і падсыпаў у кармушку. «Рыхтуюся да зімы я загадзя. Корм для птушак закупляю па восені. Як правіла, дзевяноста кілаграмаў семечак і сто кілаграмаў проса. Гэта, вядома, накладна, але ж, як смяюся, я не куру і не п'ю. І заклікаю беларусаў ды беларусак таксама кідаць дурное, а грошы, якія будуць вызваляцца ад шкодных звычак, пускаць на корм птушкам. Я ўжо шмат гадоў запар семечкі купляю ў аднаго і таго ж мужчыны, дык ён мяне ведае і робіць добрую зніжку, аддае па тры рублі за кілаграм». Антон Раманоўскі распавёў, што не адразу выйшаў на такія аб'ёмы кармлення. Спачатку зрабіў аднаярусную кармушку. Але потым зразумеў, што сінічкам па душы семечкі, а вераб'ям — проса, так у птушынай сталоўцы з'явіўся другі ярус.

«Вой, гляньце, якая прыгажосць!» — паказвае Антон Аляксеевіч на купку вераб'ёў ды сінічак, якая апусцілася падсілкавацца. Твар мужчыны ў гэты момант свеціцца ад радасці. Праз некалькі секунд птушкі зноў пырхнулі на дрэвы. «Гэта ў іх такая абарона. Схапілі семечку і ляцяць даядаць на дрэва, там ужо толькі разлушчваюць яе. Прычым, як вы, пэўна, заўважылі, яны дзеляцца на дзве часткі: адна палова хаваецца на дрэве, што справа, другая — на тым, што злева. Яны ведаюць, што каршун не дрэмле, таму перастрахоўваюцца».

— Мы, калі пераехалі жыць у вёску, таксама павесілі кармушку перад акном. Але яе чамусьці птушкі ігнаруюць, — дзялюся я.

— У вас, напэўна, адкрыты ўчастак. Птушкам абавязкова трэба абарона: дрэвы, кусты, каб было дзе схавацца. Такая ж праблема і ў майго суседа. Ён таксама вельмі любіць птушак. Штодня прыходзіць да мяне імі любавацца, бо да яго ў двор яны не прылятаюць, не адчуваюць сябе там у бяспецы. Некаторыя кажуць: «Навошта табе гэта ўсё, птушкі самі сабе корм знойдуць». Але я з гэтым не згодны, пярнатым зімой трэба дапамагаць. Я ў кнізе прачытаў, што смяротнасць сярод вераб'ёў асабліва вялікая, шмат маладых птушак гіне ў населеных пунктах яшчэ ў першую зіму, хоць іх сярэдняя працягласць жыцця паўтара года. Дарэчы, верабей — адна з маіх любімых птушак. Яны, як і іншыя пярнатыя, прыносяць вельмі вялікую карысць і для лесу, і для саду. Недарэмна больш як 150 гадоў таму ў Ботане ўсталявалі помнік вераб'ю. А ўсё таму, што гэтыя птушкі знішчылі ўсіх насякомых-шкоднікаў, якія раптоўна напалі на горад. Дарэчы менавіта дзякуючы пярнатым, лічу, у мяне сад здаровы без прымянення ўсялякай хіміі.

Антон Аляксеевіч прызнаўся, што любоў да птушак у яго з дзяцінства. Калі быў падлеткам, пасвіў на лузе з дзедам кароў і слухаў спевы жаўрукоў.

— Каб назіраць увесну і ўлетку за шпакамі, зрабілі з сынам чатыры шпакоўні. Любуюся, як пярнатыя з ранку да вечара бесперастанку кормяць сваіх птушанят. Вось як трэба клапаціцца пра сваю сям'ю. Я абураюся, калі па тэлевізары паказваюць, што мужчыны разводзяцца, дзяцей кідаюць. Як так можна? Людзям шмат чаму можна павучыцца ў птушак... Вяхір улетку тут у мяне гняздзіцца, вунь бачыце гняздо на дрэве. У нас тут лес побач. Чулі б вы, як у сезон тут заліваюцца салаўі! Штораз здзіўляюся: такая малюсенькая птушачка, а так прыгожа спявае!

«ТРЭБА КУПІЦЬ БРЫЛЬЯНТ...»

— Ну што, не падвёў я вашы чаканні, атрымалі вы задавальненне? — пытаецца ўжо ў хаце Антон Аляксеевіч. — Птушкі на мяне аказваюць псіхатэрапеўтычнае ўздзеянне, гэта цалкам замяняе медыкаментознае лячэнне. Апрануся цёпла, сяду ў крэсла на верандзе і любуюся імі, слухаю птушыныя трэлі. Святлана Васілеўна, жонка мая, падтрымлівае мяне ў маім захапленні. Яна, дарэчы, таксама медык па прафесіі, ужо некалькі гадоў не ходзіць. Дык я яе да акна на калясцы падвязу, і яна таксама любуецца птушкамі.

...Гэтай вясной споўніцца шэсцьдзясят гадоў, як жывём разам з жонкай. А раз брыльянтавае вяселле, дык трэба купіць брыльянт, — усміхаецца Антон Аляксеевіч. Я раней Свеце любіў упрыгожванні дарыць. Хацеў рабіць свята 3 мая, сабраць гасцей, самых блізкіх. Але ж пост яшчэ будзе, сёлета Вялікдзень позні, прыпадае на 5 мая, таму, відаць, прыйдзецца перанесці святкаванне на пару дзён.

— Антон Аляксеевіч, падзялімся сакрэтам доўгага сумеснага жыцця.

— Стараць сям'ю і нараджаць дзяцей трэба па каханні. Вось галоўны сакрэт. А яшчэ вельмі важна ў сям'і: выпрацоўваць цярпенне, не сячы з-за пляча. Часам, бывала, так разазлуешся, што, здаецца, укусіў бы *(смяецца)*. А потым падумаеш: ты ж сам далёка не анёл. Саступаць трэба, у любой спрэчнай сітуацыі ставіць сябе на месца іншага. Мы са Светай пражылі добрае жыццё. Цяпер нам, вядома, не проста. Здароўе з кожным годам лепш не становіцца. Святлана Васілеўна мяне абагнала. Яна 10 таблетак прымае ў дзень, а я — 9. Але ж я хоць хаджу, а яна, бедная, пакутуе ад болю. Аперыраваць яе суставы нельга, бо ў яе парок сэрца. Я не скарджуся на свой лёс. Дасць бог, яшчэ пажывём. У сакавіку Свеце будзе 83 гады, мне — 84. Дзеці ў нас цудоўныя, прыязджаюць, дапамагаюць. У нас у сям'і шмат медыкаў. Дачка і нявестка — кардыёлагі, зяць — акушэр-гінеколаг. Сын — дацэнт кафедры эндакрыналогіі ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Белдзяржмедуніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, яго «школа дыябету» набрала больш як 400 тысяч праглядаў на YouTube.

...Пасля выхаду на пенсію мы з жонкай жывём у вёсцы. Мець свой кавалак зямлі — гэта шчасце. У мяне ёсць дзве цяпліцы. Дзеці на мяне, вядома, сварацца, перажываюць, каб я пабярог сябе і менш кланяўся градкам. Але я люблю садзіць памідоры, агуркі, бо мне патрэбная фізічная нагрузка. Навошта мне велатрэнажор? Лепш буду паціху корпацца ў агародзе. Люблю, калі дом патанае ў кветках. Раней рукамі ды гладыёлусамі займалася жонка. Цяпер я пад яе кіраўніцтвам *(смяецца)*.

«КАЛІ ЕХАЛІ НА МАГІЛУ ТАТЫ, БЫЛО АДЧУВАННЕ, ШТО ГУДЗІЦЬ ЗЯМЛЯ...»

У доме Раманоўскіх вялікая сцяна завешана фотаздымкамі.

— Я люблю свой стэнд, тут уся мая радня: дзеці, унукі, праўнук і праўнучка. Вось тут вяселлі дачкі і сына. А гэта першы і апошні Усесаюзны з'езд урачоў, бо Савецкі Саюз разваліўся. На наступным фота — як адзначалі маё 80-годдзе. А вось гэта мае ўрадавыя ўзнагароды: за больш як дваццаць гадоў работы ў Гомельскай вобласці я атрымаў Ордэн «Знак Пашаны» і Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Апошнюю ўзнагароду мужчына атрымаў за ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Калі адбыўся выбух на ЧАЭС, Антон Раманоўскі быў загадчыкам аддзела аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама. Знаходзячыся працяглы час у 30-кіламетровай зоне, арганізоўваў адсяленне людзей, іх лячэнне і аздараўленне. Удзельнічаў у стварэнні Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека.

— Многія людзі не хацелі з'язджаць, бо трэба было кідаць хаты, гаспадарку. Як цяпер памятаю, з Хойнікаў прывезлі бабулю, ёй было пад сто гадоў. Яна падышла да мяне і пытаецца з надзеяй у голасе: «Сынок, скажы, вярнуся я ў сваю хату ці не?» Тая бабуля ў мяне і цяпер перад вачыма стаіць. Няпростыя былі часы. Але самае галоўнае, што прайшло ўжо 37 гадоў, і радыяцыя паменшылася амаль у два разы, ідзе паляпшэнне глебы.

Разам са сваімі ордэнамі Антон Аляксеевіч прынёс два фотаальбомы: адзін — працоўны, другі — сямейны. У першым шмат здымкаў, зробленых падчас работы генеральным сакратаром Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа.

— Менавіта дзякуючы службе вышуку Чырвонага Крыжа я знайшоў магілу свайго таты, які загінуў на фронце 7 сакавіка 1945 года. Мы тады многім людзям дапамаглі знайсці сваіх сваякоў, якія былі забітыя ці трапілі ў палон падчас вайны. Тата пахаваны ў Гожаве Велікапольскім. Я чатыры разы быў у яго на магіле. Калі першы раз ехаў туды праз вялізны сасновы лес, было адчуванне, што зямля гудзіць, як быццам гэта тата стогне. Калі прачытаў на помніку «Раманоўскі А.», не мог стрымаць слёз. Гэта былі слёзы невымоўнай тугі і радасці, што я ўсё ж такі трапіў на магілу бацькі, як быццам пабачыўся з ім. Я тату зусім не памятаю. Калі ён сышоў на вайну, мне было ўсяго чатыры гады. Але я добра памятаю, як горка плакала мама, калі прыйшла пахаванка. У 30 гадоў яна засталася ўдавой, замуж больш не выйшла, гадавала нас з братам адна. Праз нейкі час яе паклікалі ў ваенкамат і перадалі Ордэн Айчыннай вайны II ступені, якім тата быў узнагароджаны пасмяротна.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК,
Мінскі раён.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Сугучча

У МАРЫЙ ЭЛ ПЕРАКЛАЛІ КУПАЛАЎСКІ «КУРГАН»

Добрая літаратурная, сяброўская навіна прыляцела з Ёшкар-Алы — сталіцы Марый Эл. У гэтым расійскім рэгіёне выходзіць літаратурна-мастацкі часопіс «Ончыко» («Наперад»). На старонках выдання, якое ўжо шмат дзесяцігоддзяў прапагандуе марыйскую літаратуру і марыйскую мову, апошнім часам штогод друкуюцца пераклады твораў беларускіх паэтаў і празаікаў. У прыватнасці, надрукаваны вершы, апавяданні, казкі Генадзя Аўласенкі, Алеся Бадака, Рыгора Барадуліна, Навума Гальпяровіча, Алега Ждана, Міколы Мятліцкага... Новая публікацыя — паэма «Курган» народнага песняра Беларусі Янкі Купалы ў перакладзе на марыйскую мову, які здзейсніў Анатоль Ціміркаеў. Паэма друкуецца ў трэцім, сакавіцкім, нумары часопіса «Ончыко».

Створаная больш за стагоддзе таму паэма-балада Янкі Купалы «Курган» (упершыню надрукаваная ў газеце «Наша ніва» 2 чэрвеня 1912 года) перакладзеная на многія мовы народаў свету: рускую (існуе некалькі перакладаў — М. Браўна, С. Гарадзецкага, Н. Кісліка і іншых яркіх паэтаў), узбекскую (перакладчык Міртэмір), асецінскую (А. Пухаеў), балгарскую (Н. Вылчаў), кітайскую (Чжу Цзі)... Марыйскі паэт і перакладчык Анатоль Ціміркаеў — вядомы ў Расійскай Федэрацыі, у Марый Эл, літаратар. Нарадзіўся ў 1952 годзе. Друкуецца з 1965 года. У свой час займаў пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Ончыко». Вершы Анатоля Ціміркаева перакладзеныя на рускую, эстонскую, фінскую, чувашскую, удмурцкую, мардоўскую мовы. Дарэчы, марыйскі перакладчык «Кургана» — і перакладчык «Яўгенія Анегіна» А. С. Пушкіна (за гэтую працу Анатоль Ціміркаеў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Марый Эл імя С. Чавайна).

— Я пад уражаннем ад купалаўскай творчасці, — пракаменціраваў літаратурную падзею перакладчык Анатоль Ціміркаеў. — «Курган» захапіў усю маю свядомасць. І праз стагоддзе чуцен боль, чуцен стогн не толькі гусляра, народнага музыкі, чуцен голас мастацтва, якое ў сваёй шчырасці і нераўнадушнасці заўжды абуджае народ, даносіць да яго праўду. Зараз я працую над перакладамі паэзіі сучасных беларускіх паэтаў. У бліжэйшы час з'явяцца новыя публікацыі, якія адкрыюць марыйскаму чытачу шмат новага і цікавага.

Сяргей ШЫЧКО.

НА ПАРОЗЕ АНАРХІІ

Што адбываецца ў Польшчы?

У Польшчы разгортваецца востры палітычны крызіс. Супрацьстаянне паміж прэзідэнтам краіны Анджэем Дудам і прэм'ер-міністрам, лідарам парламенцкай большасці Дональдам Тускам працягвае абвастрацца. Сітуацыя ў суседняй краіне часам нагадвае «тэатр абсурду», калі рэальныя дзеянні падмяняюцца палітычнай «буфанадай». Пасля абвяшчэння летась у кастрычніку вынікаў парламенцкіх выбараў такі расклад прагназаваўся, аднак простым палякам, якія спадзяваліся на змены да лепшага, аптымізму гэта зусім не дадае. Што ж адбываецца ў Польшчы, якія перспектывы далейшага развіцця падзей?

ПЛАН БАДНАРА

Днямі стала вядома, што польскі ўрад на чале з прэм'ер-міністрам Дональдам Тускам мае намер ажыццявіць судовую рэформу, у тым ліку перапрызначыць лаяльных былым уладам краіны суддзяў Канстытуцыйнага суда, з мэтай пераканаць ЕС адмяніць санкцыйную працэдуру ў дачыненні да Варшавы. Пра гэта заявіў міністр юстыцыі Польшчы Адам Баднар у інтэрв'ю газеце Financial Times, паведаміла ТАСС. «Наша задача — зрабіць усё магчымае наяўнымі інструментамі», — падкрэсліў міністр. Ён адзначыў, што планы новага ўрада могуць наткнуцца на супрацьдзеянне з боку прэзідэнта краіны Анджэя Дуды, які прадстаўляе былую партыю ўлады «Права і справядлівасць» (ПіС). У прыватнасці, прэзідэнт можа накласці вета на запланаванае рашэнне кіруючай кааліцыі памяняць усіх 15 членаў Канстытуцыйнага суда (КС), якія былі прызначаныя папярэднім урадам ПіС. У гэтым выпадку, сказаў Баднар, перастаноўкі ў КС давядзецца адкласці да наступных прэзідэнцкіх выбараў у 2025 годзе.

Польскі міністр таксама паведаміў выданню аб намеры да канца месяца прадставіць крокі па судовай рэформе сваім калегам па Еўрасаюзе для таго, каб пераканаць Брусель спыніць у дачыненні да Варшавы санкцыйную працэдуру па артыкуле 7 Дагавора аб ЕС. «Сваімі наступнымі дзеяннямі я пастараюся пераканаць [ЕС. — **«Зв.»**], што артыкул 7 павінен быць адменены для Польшчы — і Канстытуцыйны суд з'яўляецца толькі часткай гэтай дыскусіі», — заявіў палітык.

План Баднара, акрамя змены складу КС, будзе ўключаць «па меншай меры пяць-шэсць законапраектаў» па аднаўленні незалежнасці судовай сістэмы, у тым ліку органа, які прызначае суддзяў. Раней міністр нацыянальнай абароны Польшчы Уладзіслаў Касіняк-Камыш паведаміў у эфіры радыё-праграмы Polskie Radio, што ўрад мае намер змяніць асноўны закон краіны, унёсшы ў яго папраўкі, звязаныя з сістэмай правасуддзя.

Як вядома, у сярэдзіне снежня 2015 года польскі Сейм (ніжняя палата парламента), большасць месцаў у якім было ў ПіС, прыняў папраўкі да закона аб Канстытуцыйным судзе. Змены прадугледжвалі прыняцце рашэнняў дзвюма трацінамі галасоў супраць звычайнай большасці раней. У 2017-м парламент Польшчы прыняў законы аб рэформе Нацыянальнага судовага савета краіны і Вярхоўнага суда, па якіх 15 членаў савета, які прызначае ўсіх суддзяў, пачалі абірацца на чатырохгадовы тэрмін Сеймам (які, нагадаем, тады кантраляваў ПіС), а не ў судовым асяроддзі, як гэта рабілася раней.

Вярхоўны суд атрымаў права па прадстаўленні мясцовых судоў пераглядаць справы, рашэнні па якіх былі ўжо вынесены на працягу апошніх 20 гадоў. У снежні таго ж года Еўракамісія ўпершыню ў гісторыі ЕС запусціла санкцыйную працэдуру ў дачыненні да Польшчы за парушэнне фундаментальнага прынцыпу незалежнасці судовай сістэмы, якая можа прывесці да пазбаўлення краіны права голасу ў Савеце ЕС у адпаведнасці з 7-м артыкулам Дагавора аб ЕС.

А ДУДА СУПРАЦЬ

Раней прэм'ер Дональд Туск заявіў, што не разумее паводзінаў Анджэя Дуды. Пра гэта ён паведаміў у Бруселі, куды прыбыў на пазачарговую сустрэчу лідараў дзяржаў Еўрасаюза. «Я не разумею паводзінаў прэзідэнта, паколькі яны нясуць рызыку як для яго самога, так і для нашай Айчыны. З такімі паводзінамі нельга пагадзіцца. Мне крыху сумна, паколькі ў нас [наперадзе] яшчэ больш за год супрацоўніцтва», — цытуе Туска польскі інтэрнэт-партал onet.pl. «Мне шкада, што прэзідэнт Дуда мае намер перашкаджаць ураду», — дадаў прэм'ер.

На мінулым тыдні Дуда падпісаў закон аб дзяржаўным бюджэце на 2024 год і адначасова адправіў гэты дакумент у Канстытуцыйны суд (КС) для высвятлення, ці не быў парушаны закон пры прыняцці ў Сейме гэтага бюджэту, паколькі ў галасаванні не прымалі ўдзел дэпутаты Марыюш Камінскі і Мачэй Вонсік, якія знаходзіліся ў турме. Па законе КС не абмежаваны па часе ў разглядзе дакументаў. Адпраўляючы прынятыя Сеймам і ўрадам Туска законы на разгляд у КС, прэзідэнт такім чынам атрымлівае магчымасць тармазіць работу ўрада.

Акруговы суд Варшавы адхіліў іск да журналіста Яраслава Мазанека, які назваў былую партыю ўлады ў Польшчы «Права і справядлівасць фашысцкай. На думку суддзі Дароты Газалба-Гангалевіч, карэспандэнт «рэалізаваў канстытуцыйны прынцып свабоды слова». Скандал разгарэўся летась падчас парламенцкіх выбараў. Тады журналіст «Газеты Мышкуўскай» (ад горада Мышкуў у Сілезскім ваяводстве) Яраслаў Мазанек назваў «Права і справядлівасць» «фашысцкай партыяй», за што на яго падалі ў суд. І вось цяпер акруговы суд Варшавы адхіліў іск цалкам, абавязаўшы ПіС выплаціць 737 злотых у якасці судовых выдаткаў. Аб сваёй перамозе журналіст напісаў на сайце «Газеты Мышкуўскай». Журналіст падкрэсліў, што для яго самае галоўнае тое, што ён зараз «мае права называць «Права і справядлівасць» фашысцкай партыяй». Адным з экспертаў у судзе стаў выкладчык Варшаўскага ўніверсітэта прафесар Мацей Гурэцкі, які заявіў, што ПіС «культурна таксічная».

НЕБЯСПЕЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

Польшча стаіць на парозе анархіі з-за прававых канфліктаў, якія ўспыхваюць паміж галінамі дзяржаўнай улады, лічыць першая старшыня Вярхоўнага суда краіны Малгажата Маноўская, паведаміла РІА «Новости». Нягледзячы на тое што летась восенню партыя «Права і справядлівасць» Яраслава Качыньскага прайграла парламенцкія выбары і пайшла ў апазіцыю, у краіне дзейнічаюць суды, склад якіх быў сфарміраваны падчас праўлення ПіС. Гэта часта прыводзіць да прававых канфліктаў з цяперашняй уладай. Дзеючы прэм'ер Дональд Туск абвінавачвае сваіх палітычных апанентаў у спробе падпарадкаваць сабе суды ў краіне. Яны адказваюць яму абвінавачваннямі ў тым, што ён пачаў кіраваць краінай, часта прымаючы рашэнні ў абыход права.

«Яшчэ не ў поўнай сіле і не ў поўнай красе, але зародкі анархіі ў нас пэўна ёсць, — адзначыла Маноўская ў інтэрв'ю парталу Onet. — Я думаю, што калі б кожны дзяржаўны орган і суб'ект рабілі тое, што павінны былі рабіць, і паважалі свае паўнамоцтвы, хаосу, безумоўна, было б менш». Маноўская не змагла назваць вінаватых у бягучай сітуацыі: «Давайце памятаць, што цяперашняя сітуацыя з'яўляецца адным з наступстваў вялізнай сацыяльнай палярызацыі, і тут ёсць свае «заслугі» ў абодвух бакоў канфлікту, а не толькі ў палітыкаў».

«Усе разам прывялі да гэтай небяспечнай для Польшчы сітуацыі. Вядома, наш нацыянальны характар, наша сварлівасць і нездольнасць дамовіцца паміж палітыкамі ўсіх масцяў. Я кажу не толькі пра той варыянт, які быў ва ўладзе тады, ці пра той варыянт, які ва ўладзе зараз, таму што ў мяне такое ўражанне, што цяперашняя кіруючая кааліцыя ўступіла ў фазу балансавання на грані закону, часам нават выходзячы за яе межы», — ацаніла суддзя, заклікаўшы палітыкаў усіх палітычных перакананняў «мець смеласць сесці і прадметна пагаварыць аб вырашэнні праблем, замест таго, каб імкнуцца да большай палярызацыі».

На думку Маноўскай, краіна апынулася на краі прорвы: «Я сапраўды ў жаху ад таго, што можа здарыцца ў будучыні». Паводле слоў суддзі, спачатку яна ўспрымала супрацьстаянне паміж галінамі ўлады «хутчэй як жарт з доляй горычы», але цяпер гэтая сітуацыя выклікае ў яе трывогу. Маноўская патлумачыла, што баіцца «ардынарнага парушэння прынцыпу законнасці», калі кожны «можа лічыць сябе Цэзарам, які стаіць над законам».

КРЫЗІС НА КРЫЗІСЕ

Усе гэтыя падзеі разгортваюцца на фоне найцяжэйшага дэмаграфічнага крызісу. Колькасць насельніцтва Польшчы скарацілася летась на 137 тысяч чалавек, сведчаць звесткі Галоўнага статыстычнага ўпраўлення краіны. Летась нарадзіліся 272 тысячы дзяцей, што на 11 працэнтаў менш за паказчыкі годам раней. Скарачаецца таксама і колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту.

Радыёстанцыя RMF24 прыводзіць меркаванне сацыёлагаў, якія адзначаюць, што палепшыць сітуацыю з нараджальнасцю ў краіне не дапамагло нават узмацненне жорсткасці закона аб абортах — забарону перарываць цяжарнасць у выпадку выяўлення паталогіі плода. На думку навукоўцаў, каб выправіць становішча, неабходна падтрымка моладзі, перш за ўсё жыллёвыя праграмы, а таксама сацыяльная работа з дваццацігадовымі. «Вельмі малая колькасць людзей гэтага ўзросту ў прынцыпе дэкларуе жаданне мець дзяцей, няма станоўчай атмасферы. Хутчэй, усе думаюць пра дзяцей, як пра фактар, які адымае час, грошы і ўвогуле гэта непажадана», — з горыччу заўважыў доктар навук з аддзела дэмаграфіі Галоўнай гандлёвай школы Польшчы Кшыштаф Тыміцкі, словы якога прыводзіць радыё. Паводле яго слоў, сярод людзей старэйшага ўзросту мала тых, хто вырашаецца на другое дзіця, прычына часцей за ўсё ў недахопе сродкаў і жыллёвых умовах.

Цяперашні дэмаграфічны крызіс — праблема для пенсіённай сістэмы, дадаў эксперт, калі ў бліжэйшыя гады сітуацыя не зменіцца, усё менш маладых будуць працаваць на забеспячэнне пенсіі, са складанасцямі сутыкнецца таксама і рынак працы, якому давядзецца прыцягваць усё больш мігрантаў. «Паводле ацэнак, каб захаваць бягучы ўзровень эканамічнага развіцця, да 2050 года нам трэба каля 5 мільёнаў чалавек», — сказаў кіраўнік Саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Цэзарый Казмерчак радыёстанцыі RMF24.

Не змяншаюцца і пратэсныя настроі. Да прыкладу, польскія фермеры з 9 лютага плануюць пачаць забастоўку ў знак пратэсту супраць еўрапейскай аграрнай палітыкі. Пра гэта заявілі ініцыятары акцыі з прафсаюза «Салідарнасць», паведаміў партал Agropolska. Чакаецца, што стачка працягнецца месяц. Пачаць акцыю пратэсту аграрыі плануюць з перакрыцця польска-ўкраінскіх памежных пераходаў, таксама ў іх планах — блакада дарог і аўтастрад у асобных ваяводствах.

«Сяляне, давайце аб'яднаемся ў дзеянні. Наша цярпенне скончылася. Пазіцыя Бруселя ад студзеня 2024 года не можа быць прынятая нашай аграрнай супольнасцю. Акрамя таго, пасіўнасць польскіх улад і дэкларацыі аб супрацоўніцтве з Еўракамісіяй, а таксама заявы аб выкананні ўсіх рашэнняў ЕС адносна імпарту сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання з Украіны не пакідаюць нам іншага выбару, акрамя як аб'явіць усеагульную забастоўку», — заявілі прадстаўнікі прафсаюза.

Аграрыі запэўнілі, што будуць «змагацца да канца». «Польскія сямейныя фермы з'яўляюцца асновай харчовай бяспекі краіны. Здаровая ежа, якая вырабляецца польскімі фермерамі, з'яўляецца асновай харчавання і здароўя грамадзян Рэспублікі Польшча, — заявілі пратэстоўцы. — Мы змагаемся за агульную карысць, спрабуючы прадухіліць банкруцтва польскіх сямейных хатніх гаспадарак, якія часам налічваюць некалькі пакаленняў».

Ва ўлады — зусім іншыя прыярытэты. Стала вядома, што Варшава ўзмацняе ваенную актыўнасць на ўсходняй граніцы. Аператыўнае камандаванне ўзброеных сіл Польшчы распаўсюдзіла навігацыйнае папярэджанне для пілотаў у прыгранічы з Беларуссю, Расіяй і Украінай. А таксама на ўчастку Балтыйскага мора на ўсход ад Гданьска. Раней паведамлялася, што ў рамках маштабных вучэнняў HATA Steadfast Defender — 2024 Польшча правядзе нацыянальныя вучэнні Dragon-24 з удзелам 20 тысяч вайскоўцаў, у тым ліку з іншых краін альянсу. Як заявіла прэс-служба польскага абаронага ведамства, манеўры пройдуць на мяжы лютага і сакавіка. Гіена не губляе агрэсіўнасці.

Пётр ДУНЬКО.

Извещение о проведении **13 марта 2024 года** торгов **№ 1-РМ** на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе и в подвижном составе, принадлежащим государственному предприятию «Минский метрополитен»

№ предмета торгов	Место размещения средства рекламы (согласно схеме)	Вид средства рекламы	Количество и размер средства рекламы	Материал изготовления средства рекламы	Срок действия договора	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учетом НДС)
1	Входные–выходные группы первых дверей станций: Уручье, Борисовский тракт, Восток, Московская, Парк Челюскинцев, Академия наук, Площадь Я. Коласа, Площадь Победы, Октябрьская, Площадь Ленина, Институт культуры, Грушевка, Михалово, Петровщина, Малиновка, Каменная Горка, Кунцевщина, Спортивная, Пушкинская, Молодежная, Фрунзенская, Немига, Купаловская, Первомайская, Пролетарская, Тракторный завод, Партизанская, Автозаводская, Могилёвская, Ковальская Слобода, Вокзальная, Площадь Ф. Богушевича, Юбилейная площадь	Стикеры на входных–выходных группах первых дверей станций метро	Размер рекламного поля до 20 см х 80 см или до 0,16 кв. м включительно ИТОГО: 433 ед.	Самоклеящаяся плёнка с удаляемым прозрачным клеевым слоем с нанесённым рекламным сюжетом	С 1 апреля 2024 года по 31 марта 2027 года	12 343,42
2	Уручье, Восток, Академия наук, Площадь Я. Коласа, Площадь Победы, Площадь Ленина, Институт культуры, Малиновка, Каменная Горка, Кунцевщина, Пушкинская, Фрунзенская, Немига, Купаловская, Партизанская	Плазменный, жидкокристаллический дисплей без аудиоконтента	56 ед. – размер рекламного поля до 2,0 кв. м ИТОГО: 56 ед	-	С 1 мая 2024 года по 30 апреля 2029 года	13 939,20
3	Станция «Тракторный завод» ВБ-1	Плазменный, жидкокристаллический дисплей без аудиоконтента	1 ед. – размер рекламного поля до 2,0 кв. м ИТОГО: 1 ед.	-	С 1 мая 2024 года по 30 апреля 2029 года	116,16
4	Станция «Партизанская» ВБ-2	Плазменный, жидкокристаллический дисплей без аудиоконтента	1 ед. – размер рекламного поля до 2,0 кв. м ИТОГО: 1 ед.	-	С 1 мая 2024 года по 30 апреля 2029 года	232,32
5	Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215 х 315 мм	Рекламный плакат	Рекламный плакат формата 210 х 297 мм. По второй линии – в 29 составах: каждый 2, 4 вагон, верхний ряд – 18 ед.; (места № 1, 3, 5, 7, 9 (11), 13, 15, 17 (19), 21, 23 (25), 27, 29, 31 (33), 35, 37, 39). ИТОГО: 1 044 ед.	Немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150–170 г/м²	С 1 апреля 2024 года по 31 марта 2027 года	20 597,70

Необходимые условия оплаты услуг по размещению рекламы:
- цена продажи предмета торгов учитывается в счет оплаты оказания рекламных услуг по договору за 1-й месяц размещения;
- победитель торгов (лицо, приравненное к победителю торгов) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов обязан перечислить на счет государственного предприятия «Минский метрополитен» обеспечение исполнения договора. Обеспечение исполнения договора предоставляется на сумму, равную сумме продажи предмета торгов и учитывается в счет оплаты оказания рекламных услуг по договору за 12-й месяц (исполнение договора) или 1 (один) последний месяц при досрочном расторжении договора либо при отказе от исполнения договора;
- условием оплаты услуг по размещению рекламы является предоплата за текущий месяц в размере 100 % в первые 3 рабочих дня текущего месяца;
- стоимость услуг по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и установленная договором, действует на первые 12 месяцев размещения, в дальнейшем ежегодно стоимость услуг по размещению рекламы пересчитывается путем увеличения на индекс потребительских цен.

Дополнительные условия по предметам торгов №№ 2, 3, 4:
